Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

14 ЖНІЎНЯ 2021 г. СУБОТА № 155 (29524)

ЮБІЛЕЙ МУЗЕЯ КОЛАСА 14

КАБУЛ ПАД ПРЫЦЭЛАМ 15

ЦЫТАТА ДНЯ

Галіна КАВАЛЁВА, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі кантрольнай дзейнасці Міністэрства па падатках і зборах:

«Выяўленне і спыненне парушэнняў, звязаных з выплатай заробкаў у канвертах, ужо не першы год з'яўляюцца адным з прыярытэтных кірункаў, якія адпрацоўваюць падатковыя органы. Разам з тым, у мэтах выканання даручэння кіраўніка дзяржавы гэтая работа была актывізавана. Толькі за першае паўгоддзе бягучага года ў рамках камеральнага кантролю ў адрас арганізацыі накіравана 16,5 тысячы апавяшчэнняў і паведамленняў, па выніках якіх падаходнага падатку добраахвотна выплачана каля 5 млн рублёў. Праведзена 479 праверак, па выніках якіх толькі падаходнага падатку прад'яўлена да выплаты 2,5 млн рублёў».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Хацелася б, каб тое, на чым заўсёды трымалася жыццё і наш чалавек, засталося»

Фота БелТА.

Ацаніць абароты ўборачнай і ўбачыць у рабоце новае слова ў сельгастэхніцы, стаць госцем «адкрытага ўрока» ў вёсцы будучыні і «адпачыць душой» пасля гарадской мітусні... Акцэнты і заўвагі на палях, якія рабіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падчас рабочай паездкі ў Рагачоўскі раён Гомельскай вобласці, слухала і наш карэспандэнт.

ЗАХАВАЦЬ ПАРАДАК НА ВЁСЦЫ

Падчас візіту кіраўнік дзяржавы наведаў адкрытае акцыянернае таварыства «Ціхінічы».У цяперашні час абмяркоўваецца пытанне далучэння да гаспадаркі невялікага сельгаспрадпрыемства. За далучэнне выступае кіраўніцтва ААТ «Ціхінічы». З такім крокам звязаныя планы па далейшым развіцці гаспадаркі: у планах пабудаваць новы малочнатаварны комплекс, павялічыць дойны статак.

СТАР. 2

Школьныя будні



Гамяльчанка Дзіяна КУЗЬМІЧ — прафесійны маляр, пасля заканчэння дарожна-будаўнічага каледжа яна працуе ў будаўнічым трэсце № 14 абласнога цэнтра. Малады будаўнік марыць стаць інжынерам і таму працягвае вучобу — цяпер на завочным аддзяленні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту. Гэтымі днямі Дзіяна з іншымі будаўнікамі ўзводзіць школу ў новым мікрараёне Гомеля.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У сезон

«ЗАКУПІМ УСЁ, ШТО ВЫРАСЛА»

Што можна здаць у комплексны прыёмны пункт?

«Белкаапсаюз» працягвае нарыхтоўку ягад, грыбоў і пладова-агародніннай прадукцыі ў насельніцтва. Сельгаспрадукцыі і сыравіны арганізацыямі спажывецкай кааперацыі з пачатку года закуплена на суму 279 млн беларускіх рублёў, у тым ліку насельніцтву выплачана за здадзеную прадукцыю і сыравіну Br191 млн рублёў. Мы адправіліся на нарыхтоўчы пункт Баранавіцкага райспажыўтаварыства, каб высветліць, што сёлета прыносяць і прывозяць у прыёмна-нарыхтоўчыя пункты, і наколькі выгадна здаваць нарыхтоўшчыкам лішкі сельгаспрадукцыі і дары лесу.

ГОД НА ГОД НЕ ПАДОБНЫ

Нягледзячы на разгар летняга сезона, здаць лішкі сельгаспрадукцыі можна без усялякай чаргі. Нарыхтоўшчыкі наракаюць на тое, што гэтым летам, здараецца, сядзяць без работы.

— Неўраджай, — разводзіць рукамі **намеснік старшыні Баранавіцкага райспажыўтаварыства па нарыхтоўках, вытворчасці і знешнеэканамічнай дзейнасці Іосіф ШУСТАЛ**. — Няма аб'ёмаў. Магчыма, з-за гарачыні. Сады цвілі добра, а ўраджаю няма. Нават яблычны апад здаюць слаба. Парэчкі летась мы бралі па 30-40 капеек за кілаграм, у гэтым бяром па 90 — і амаль не здавалі. Вішні летась бралі да рубля, сёлета — па рубель пяцьдзясят за кілаграм, і таксама амаль ніхто не прыносіў. Слівы — тое ж самае. У гэтым годзе яблыкі гніюць проста на галінках, не паспяваючы выспець. Адно слова — неўраджай.

— Мы закупляем практычна ўсё, што расце ў садзе і агародзе, — распавядае **нарыхтоўшчыца Баранавіцкага райспажыўтаварыства Зінаіда МЯЛІК.**

Перад тым як прыняць гародніну, садавіну, ягады і грыбы, нарыхтоўшчыкі адпраўляюць іх на радыелагічны кантроль і ў лабараторыю. Нітраты, радыенукліды, іншыя паказчыкі — толькі пры адсутнасці нават мізэрнага перавышэння нормы прадукцыя будзе прынята.

СТАР. 4

КАРАТКА

- **Зарплата бюджэтнікаў вырасце. З 1 жніўня базавая стаўка для бюджэтных арганізацый устаноўлена ў памеры Br198.**
- Каля 700 тон бахчавых культур плануецца сабраць у Беларусі.
- **Сусветная арганізацыя аховы здароўя не настойвае на ўвядзенні абавязковага вакцынавання ад COVID-19.**
- БУТБ адзначае зніжэнне цэн на драўняную сыравіну на ўнутраным рынку.
- **Нацыянальная бібліятэка Беларусі абвясціла конкурс на найлепшае эсэ пра творчасць Зміцера Бядулі.**
- Штогод падатковыя органы Беларусі аналізуюць даходы каля дзесяці тысяч грамадзян.

ISSN 1990 — 763X

«Хацелася б, каб тое, на чым заўсёды трымалася жыццё і наш чалавек, засталося»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Калі кіраўнік «за», — гэта трэба вітаць, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што гэта павінен быць цалкам прадуманы крок, каб не перагрузіць гаспадарку. На яго думку, відавочны і сацыяльны аспект аб'яднання вытворчай базы. Вядома, у зоне дзейнасці падобных буйных сельгаспрадпрыемстваў знаходзяцца многія вёскі. Ёсць жа фермеры, якія жадаюць узяць зямлю, але несці сацыяльную нагрузку не жадаюць. Беларускі лідар заўважыў, што дзяржава заўсёды падтрымлівае сельгаспрадпрыемствы, якія сочаць за парадкам на вёсцы, добраўпарадкоўваюць тэрыторыі, дапамагаюць вяскоўцам у тых ці іншых пытаннях.

ЯКІ ЁН — УЗОРНЫ МАШЫННЫ ПАРК?

На тэрыторыі ААТ «Ціхінічы» Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з арганізацыяй работы механізаваных майстэрняў машынна-трактарнага парка гаспадаркі. Прэзідэнт не абмежаваўся дакладамі чыноўнікаў і кіраўніцтва арганізацыі. Канкрэтнымі дэталямі ён цікавіўся ў радавых работнікаў — ці хапае інструменту, як арганізаваныя рамонт і абслугоўванне тэхнікі. Было адзначана, што выкарыстоўваюцца інструменты айчыннай вытворчасці, у тым ліку прадукцыя Аршанскага інструментальнага завода, рашэнні па развіцці якога некалькі гадоў таму прымаліся на ўзроўні кіраўніка дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка застаўся задаволены ўбачаным, ён падзякаваў работнікам за працу і падкрэсліў важнасць якаснага і своечасовага абслугоўвання тэхнікі. Ён выслухаў і даклады аб стане спраў у сельскай гаспадарцы раёна, развіцці арганізацый. Асобны акцэнт быў зроблены на ўцягванне зямель у сельгасабарот, іх эфектыўнае выкарыстанне, меліярацыю.

НОВАЕ СЛОВА Ў ТЭХНІЦЫ І ЗНАКАВАЯ ДАТА Ў СЕЛЬГАСМАШЫНАБУДАВАННІ

На тэрыторыі гаспадаркі беларускаму лідару прадставілі ў рабоце новы самаходны збожжаўборачны камбайн GH810 (КЗС-3321). Генеральны канструктар навукова-тэхнічнага цэнтра камбайнабудавання ААТ «Гомсельмаш» Сяргей Федаровіч нагадаў, што 24 жніўня спаўняецца 25 гадоў, як было прынята рыцыповае рашэнне аб развіцці ў Беларусі айчыннага камбайнабудавання.

— 25 гадоў таму мы з ім на полі вырашалі, быць камбайну беларускаму ці не быць, — успомніў Аляксандр Лукашэнка. — Убіраць не было чым.

Прэзідэнт адзначыў, што тады многія выказваліся супраць такога рашэння, прапанавалі купляць неабходную тэхніку за мяжой. Цяпер жа ў Беларусі ёсць цэлая лінейка айчынных камбайнаў сусветнага ўзроўню.

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў падумаць над тым, каб 24 жніўня сустрэцца дзесьці ў полі і «застаўбіць» гэтую дату.

«ВЁСКА БУДУЧЫНІ»

Падчас наведвання сацыяльна значных аб'ектаў непасрэдна на тэрыторыі аграгарадка Ціхінічы кіраўніку дзяржавы былі прадстаўлены вынікі развіцця і добраўпарадкавання сельскіх населеных пунктаў у рамках праекта «Вёска будучыні».

Як было адзначана, усяго ў Беларусі ў гэты праект уключылі больш за 170 аграгарадкоў і вёсак, у Гомельскай вобласці ператварыць у «вёскі будучыні» плануюць 23 населеныя пункты (з улікам пілотнага праекта ў аграгарадку Лясквічы). Дарэчы, работа па ператварэнні аграгарадка Ціхінічы ў «вёску будучыні» запланавана да 2025 года. За апошнія два гады ў населеным пункце абнавілі дарожную інфраструктуру, адрамантавалі і пабудавалі новыя сацыяльныя і спартыўныя аб'екты, азелянілі і добраўпарадкавалі тэрыторыю аграгарадка. Таксама была ўдасканалена вытворчая сфера прадпрыемстваў камунальнай уласнасці.

САЦЫЯЛЬНЫ ЛІФТ У СПОРЦЕ

Аляксандр Лукашэнка падчас рабочай паездкі азнаёміўся з работай аднаго з сацыяльна значных аб'ектаў — фізкультурна-аздараўленчага комплексу ў Ціхінічах. Кіраўнік дзяржавы пагутарыў з трэнерамі і юнымі спартсменамі, абмеркаваў спартыўныя планы і перспектывы, а таксама выступленне беларускіх атлетаў на Алімпіядзе ў Токіа.

На думку кіраўніка дзяржавы, у любой вёсцы кожны юны спартсмен павінен мець магчымасць, калі ён хоча і паказвае добры вынік, прабіцца наверх.

— Трэба даць ім магчымасць хутка падымацца, каб ён трэніраваўся і разумеў, што яго нідзе не спыняць, — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу, што на мясцовым узроўні многае залежыць і ад саміх трэнераў, якія павінны прасоўваць сваіх вучняў і «змагацца за іх будучыню».

Аляксандр Лукашэнка скарыстаўся магчымасцю падчас рабочай паездкі сустрэцца і пагутарыць у простай нефармальнай абстаноўцы з жыхарамі аграгарадка Ціхінічы. Спецыяльна для сустрэчы Прэзідэнта з вяскоўцамі ў цэнтры аграгарадка былі ўстаноўлены лаўкі, а для кіраўніка дзяржавы падрыхтавалі мел і дошку. Так размова атрымала форму адкрытага ўрока. Прэзідэнт успомніў і свой досвед настаўніка.

Цяпер жа беларускі лідар наглядна і даступна расказаў вяскоўцам аб стратэгіі развіцця вёсак і аграгарадкоў, у тым ліку ў рамках праекта «Вёска будучыні». Каля 15 гадоў таму ў Беларусі падумалі пра тое, што «даўгі вёсцы трэба вяртаць», нагадаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, — з тых часоў былі рэалізаваны праграмы па адраджэнні вёскі, стваралася аграгарадкі, развіваўся вытворчы сектар, для патрэб сельскай гаспадаркі пачала пастаўляцца больш магутная тэхніка. Адпаведна, паўстала неабходнасць у аб'яднанні і ўзбуйненні гаспадарак. З іншага боку — паўстала пытанне, што рабіць з вёскамі, якія раней былі цэнтрамі невялікіх сельгаспрадпрыемстваў.

— Прынята рашэнне, што гэтыя ўсе вёскі трэба захаваць, — распавёў беларускі лідар. Ён умоўна пазначыў іх як вёскі другога ўзроўню, аграгарадкі — гэта вёскі першага ўзроўню.

Узнікае пытанне, і што рабіць з так званымі неперспектыўнымі вёскамі ці хутарамі.

— Трэцяга ўзроўню — самага нізкага — гэтым вёсачкам і хутарам быць, калі знойдуцца людзі, якія вернуцца ў сваю вёску або проста яе возьмуць пад апеку. Мы і зямельны ўчастак дадзім, і дапаможам. Каб толькі яна жыла, — заявіў кіраўнік дзяржавы і заўважыў, што падобныя прыклады ёсць у краіне. Разам з тым, на думку Прэзідэнта, захоўваць абсалютна ўсе вёскі трэцяга ўзроўню не варта, гэта пры сучасным узроўні развіцця вытворчасці на вёсцы і не патрэбна.

— Жыццё змянілася. За гэтай вытворчасцю падцягваецца і сацыяльная сфера — з гэтых неперспектыўных вёсак, хутароў у буйныя вёскі, а больш за ўсё — у аграгарадок, — распавёў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў аб наяўнасці ў краіне асобных планаў па развіцці пасёлкаў гарадскога тыпу і гарадоў-стотысячнікаў.

У размове з жыхарамі Ціхініч кіраўнік дзяржавы ўзняў тэму сутнасці суверэнітэту і незалежнасці, якая заключаецца ў магчымасці таго, каб беларускі народ і кожны чалавек паасобку сам вызначаў свой лёс.

— Захаваўшы сваю незалежнасць, мы будзем вызначаць свой лёс, вырашаць, у якой дзяржаве нам жыць. А за намі — нашы дзеці, — дадаў кіраўнік дзяржавы. — Прыходзіць новае пакаленне. Вы бачыце, што жыццё мяняецца. Хацелася б, каб тое, на чым заўсёды трымалася жыццё і наш чалавек, засталося: гэта праца і хлеб, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мы павінны не проста ім перадаць краіну. Мы паступова, прыводзячы ў тым ліку і да ўлады іх, павінны бачыць, кантраляваць, дзе трэба, падказваць, каб яны не страцілі ўсё тое каштоўнае, што мы з вамі напрацавалі за гэтыя гады.

Кіраўнік дзяржавы, уздымаючы і праблему палітычных інтрыг вакол Беларусі, нагадаў, што ў гісторыі ўжо не раз было, калі на тэрыторыі нашай краіны перасякаліся інтарэсы буйных сусветных гульцоў, вынікам чаго станавіліся войны.

— Я ніколькі не драматызую сітуацыю, але яна няпростая, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы будзем вырашаць усе пытанні, якія павінны вырашаць Прэзідэнт, урад, губернатары; у вас ёсць свая праца, жыццё, свае сем'і — глядзіце іх. ***Трэба будзе ваша дапамога — я паклічу вас. Пакуль жывіце спакойна, нікога не бойцеся. У нас ёсць каму вас абараніць.***

Кранальным момантам сустрэчы вяскоўцаў з Прэзідэнтам стаў сюрпрыз, які падрыхтавала для кіраўніка дзяржавы шматдзетная сям'я Анатоля і Наталлі Выдронкаў. Маладыя бацькі чацвярых дзяцей — пераможцы раённага конкурсу «Уладар сяла — 2021» — падарылі кіраўніку дзяржавы трусіка. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў і ў адказ уручыў прэзідэнцкія падарункі шматдзетнай сям'і.

Падводзячы вынікі свайго візіту на Рагачоўшчыну, Прэзідэнт прызнаўся, што адпачыў тут душой.

— Бачу, што ў нас яшчэ порах у парахаўніцах ёсць. ***Людзі ў нас моцныя, надзейныя, і іх нямала. Нас — большасць***, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Так, тут ёсць людзі са сваім меркаваннем, якія са мной не згодныя. Але гэта людзі, якія прытрымліваюцца закона і разумеюць: які б ні быў Прэзідэнт, усё адно трэба будзе працаваць, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У ЗША заявілі пра беспрэцэдэнтную колькасць мігрантаў на граніцы з Мексікай

Аб гэтым паведаміў міністр унутранай бяспекі ЗША Алехандра Маёркас. «Мы сутыкаемся з беспрэцэдэнтнай колькасцю мігрантаў на пунктах пропуску на нашай паўднёвай граніцы», — сказаў чыноўнік. — Сітуацыя на граніцы — гэта адзін з самых цяжкіх выклікаў для нас. Сітуацыя складаная, яна ўвесь час змяняецца і закранае людзей у няпростых сітуацыях на фоне глабальнай пандэміі». Паводле яго слоў, да росту гэтага паказчыка прывяло некалькі прычын, у прыватнасці, «пагаршэнне ўмоў у іх роднай краіне, у тым ліку беднасць, рост гвалту і карупцыя». Паводле даных пагранслужбы ЗША, за ліпень зафіксавана больш за 200 тысяч незаконных спроб людзей перасекчы граніцу з Мексікай і трапіць у ЗША. Амерыканскія СМІ нагадваюць, што Байдэн адышоў ад жорсткага іміграцыйнага падыходу свайго папярэдніка Дональда Трампа.

У Алжыры арыштавалі 22 чалавекі, якіх абвінавачваюць у лясных пажарах

Прэзідэнт Алжыра Абдэльмаджыд Тэбун у прамове да нацыі перасцярог ад спроб выкарыстаць лясныя пажары, якія бушуюць на поўначы краіны з пачатку гэтага тыдня, для падрыву нацыянальнага адзінства. Пра гэта паведаміла інфармацыйнае агенцтва Algerie Press Service. «Неабходна захаваць нацыянальнае адзінства, абараніць яго ад любых зламысных замахаў. Любая спроба падрыву нацыянальнага адзінства з'яўляецца злачынствам сама па сабе», — адзначыў Тэбун. Паводле яго слоў, ёсць людзі, якія карыстаюцца пажарамі ў шэрагу правінцый, каб «пагоршыць сітуацыю і паспрабаваць аддзяліць войска ад народа і народ ад дзяржавы». Як паведаміў Тэбун, «алжырскія ўлады арыштавалі 22 чалавекі, якія падазраюцца ў тым, што яны былі вінаватыя ў лясных пажарах». Паводле апошніх звестак, у пажарах загінула больш за 70 чалавек, у тым ліку каля трох дзясяткаў ваеннаслужачых арміі Алжыра. У сувязі з гэтым у краіне аб'яўлена трохдзённая жалоба.

Мальдывы ўвядуць падатак на выезд з астравоў

Улады Мальдываў прынялі папраўку ў падатковы кодэкс, паводле якой з усіх грамадзян, якія выязджаюць з краіны, у тым ліку турыстаў, будзе спаганяцца падатак. Ён будзе ўключаны ў кошт авіябілета, паведаміў партал Raajje. Падатак увядуць з 1 студзеня 2022 года. Яго будуць спаганяць замест аэрапортавага збору з усіх, акрамя дзяцей да двух гадоў і асоб, якія валодаюць дыпламатычнай недатыкальнасцю. Пасажыры эканом-класа будуць плаціць за вылет $30, пры гэтым мальдыўцы — $12. Усе пасажыры бізнес-класа, па-за залежнасцю ад грамадзянства, будуць плаціць па $60, пасажыры першага класа — $90. З пасажыраў прыватных самалётаў будуць спаганяць па $120.

Цяжкасці як акно магчымасцяў

Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА ў Навагрудскім раёне правёў выязную нараду на тэму развіцця ўнутранага турызму і выканання дзяржпраграмы «Беларусь гасцінная» на 2021—2025 гады, паведаміла БелТА.

«Гэтая сфера ў Беларусі не атрымала належнага развіцця. Малы ўклад турызму ў эканоміку. Зразумела, што тургаліна адчувае цяпер цяжкасці, звязаныя з эпідэміялагічнымі абмежаваннямі. Але разам з негатывам трэба бачыць пазітыў — гэта тое самае акно магчымасцяў, каб задзейнічаць рэзервы ўнутранага турызму», — адзначыў Раман Галоўчанка. Ён падкрэсліў важнасць узаемадзеяння з энтузіястамі, грамадскімі аб'яднаннямі.

Цікавасць да падарожжаў па краіне, на думку прэм'ера, неабходна стымуляваць і падтрымліваць. «Балючае пытанне — узровень сэрвісу. Датычыцца гэта гасцінічнага бізнесу, прыдарожнага сэрвісу, грамадскага харчавання, транспарту», — звярнуў увагу Раман Галоўчанка. Па праграме «Беларусь гасцінная» на развіццё інфраструктуры на пяцігодку прадугледжана звыш 400 мільёнаў рублёў. Пакуль тэмпы асваення ў рэгіёнах невысокія.

Раман Галоўчанка азнаёміўся з турыстычным патэнцыялам Навагрудчыны, асноўнымі аб'ектамі, сярод якіх дом-музей Адама Міцкевіча, музей яўрэйскага супраціўлення, Навагрудскі замак.

Акцэнты

«УВЕСЬ СВЕТ СТАЎ СВЕДКАМ БЕСПРЭЦЭДЭНТНАГА ЗНЕШНЯГА ЦІСКУ»

Нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Анатоль ІСАЧАНКА выступіў з заявай з нагоды эканамічнага і палітычнага ціску на нашу краіну ў адрас Генеральнай Асамблеі ААН.

— Рэспубліка Беларусь адказна падыходзіць да выканання ўзятых на сябе міжнародных абавязацельстваў па рэалізацыі Парадку дня ў галіне ўстойлівага развіцця да 2030 года, — нагадаў віцэ-спікер Савета Рэспублікі. — У нашай краіне сфарміравана нацыянальная архітэктура кіравання працэсам дасягнення Мэт устойлівага развіцця. У яе дзейнасць уцягнутыя прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці, органаў дзяржаўнага кіравання, парламенцкай супольнасці і дзелавых колаў.

Анатоль Ісачанка адзначыў, што сумесныя намаганні грамадства і дзяржавы па дасягненні Мэт забяспечылі істотны прагрэс. У прыватнасці, у індэксе чалавечага развіцця нашай краіне належыць 53-е месца ў катэгорыі краін з вельмі высокім узроўнем чалавечага развіцця; у незалежным рэйтынгу дасягнення Мэт устойлівага развіцця Беларусь займае 24-е месца са 165 дзяржаў.

— Рэспубліка Беларусь за сваю шматвяковую гісторыю, цаной гераічнага подзвігу папярэдніх пакаленняў, страціўшы кожнага трэцяга грамадзяніна ў часы Вялікай Айчыннай вайны, абараніла права на самастойнае вызначэнне шляху свайго развіцця, — падкрэсліў Нацыянальны каардынатар. — З'яўляючыся адным з заснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Беларусь захоўвае адданасць ключавым прынцыпам міжнароднага права — неўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў і іх роўнасці на міжнароднай арэне.

Ён акцэнтаваў увагу на тым, што сёння з-за разгорнутай краінамі ЕС і ЗША мэтанакіраванай кампаніі па палітычным і эканамічным ціску на Рэспубліку Беларусь высокія вынікі ў розных сферах і ў працэсе дасягнення Мэт устойлівага развіцця апынуліся пад пагрозай.

— Мы сутыкнуліся з нахабным і дзёрзкім выклікам, кінутым суверэннай, дэмакратычнай і міралюбівай дзяржаве, кожнаму яе грамадзяніну, — перакананы Анатоль Ісачанка.

Ён звяртае ўвагу, што падобная бяздумная палітыка ў дачыненні да нашай краіны сур'ёзна закранае інтарэсы не толькі беларускіх грамадзян, і нагадвае, што ў адрас Еўразаюза былі накіраваны сотні зваротаў беларускіх працоўных калектываў з заклікам спыніць неправамерны ціск. Аднак шматлікія просьбы работнікаў ігнаруюцца.

— Увесь свет стаў сведкам беспрэцэдэнтнага знешняга ціску, палітызацыі Мэт устойлівага развіцця, развязвання глабальнага крызісу ў самым цэнтры Еўропы.

Гэтыя і іншыя дзеянні супярэчаць шэрагу міжнародных абавязацельстваў, ідуць урэз з палажэннямі Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і істотна пагаршаюць права на годны ўзровень жыцця для мільёнаў людзей, — адзначыў Анатоль Ісачанка.

Ён перакананы, што ўмяшанне ва ўнутраныя справы суверэннай дзяржавы парушае Дэкларацыю аб прынцыпах міжнароднага права, якія датычацца дружалюбных адносін і супрацоўніцтва паміж дзяржавамі ў адпаведнасці са Статутам ААН, прынятай Рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі ААН 2625 (XXV) ад 24 кастрычніка 1970 года.

— Прынцып, які датычыцца абавязацельства не ўмешвацца ў справы, што ўваходзяць ва ўнутраную кампетэнцыю любой дзяржавы, абвяшчае: «Ні адна дзяржава не можа ні прымяняць, ні заахвочваць выкарыстанне эканамічных, палітычных мер або мер любога іншага характару з мэтай дабіцца падпарадкавання сабе іншай дзяржавы ў ажыццяўленні ёю сваіх суверэнных правоў і атрымання ад гэтага якіх-небудзь пераваг, — нагадаў ён. — Ні адна дзяржава не павінна таксама арганізоўваць, распальваць, фінансаваць, падбухторваць або дапускаць падрыўную, тэрарыстычную ці ўзброеную дзейнасць, накіраваную на гвалтоўнае звяржэнне ладу іншай дзяржавы, таксама як і спрыяць ёй, а таксама ўмешвацца ва ўнутраную барацьбу ў іншай дзяржаве».

Нацыянальны каардынатар таксама працытаваў адзін з прынцыпаў гэтай Дэкларацыі, у адпаведнасці з якім «дзяржавы павінны супрацоўнічаць у справе аказання садзейнічання эканамічнаму росту ва ўсім свеце, асабліва ў краінах, якія развіваюцца».

— Як Нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця ў Рэспубліцы Беларусь, звяртаюся да Генеральнай Асамблеі ААН і заклікаю:

• асудзіць грубае ўмяшанне ва ўнутраныя справы Рэспублікі Беларусь з боку замежных дзяржаў; прыняць меры па недапушчэнні выкарыстання аднабаковых прымусовых абмежаванняў у дачыненні да суверэннай дзяржавы; спыніць спланаваныя крокі шэрагу дзяржаў — членаў ААН па ігнараванні ключавых прынцыпаў міжнароднага права і пагаршэння ўзроўню жыцця мільёнаў людзей;

• стаць на абарону рэалізацыі Парадку дня ў галіне ўстойлівага развіцця да 2030 года, якая ў цяперашні час паслядоўна ігнаруецца ЗША і краінамі ЕС, што ўзялі на сябе адпаведныя высокія абавязацельствы па яе выкананні, — рэзюмаваў Анатоль Ісачанка.

У цэнтры ўвагі

Сумяшчэнне экзаменаў, мэтавая падрыхтоўка для ўсіх...

Якія змены чакаюць адукацыю

Напярэдадні рэспубліканскага педсавета з удзелам кіраўніка дзяржавы прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА правёў у БДПУ нараду па пытаннях адукацыі, на якой прысутнічалі прадстаўнікі сферы адукацыі, грамадскіх арганізацый і бацькі навучэнцаў. Пра гэта паведаміла прэс-служба ўрада.

На нарадзе, у прыватнасці, разглядаліся прапановы, якія датычацца змены фармату ўступнай кампаніі, увядзення нацыянальнага экзамену для выпускнікоў сярэдняй школы, унутранага ўступнага іспыту па профільнай дысцыпліне ва ўстановах вышэйшай адукацыі, удасканалення адбору найбольш падрыхтаваных абітурыентаў для навучання ў ВНУ.

«Сумяшчэнне выпускных экзаменаў па матэматыцы, рускай ці беларускай мовах і цэнтралізаванага тэсціравання па гэтых прадметах дазволіць паменшыць нагрузку на навучэнцаў XI класаў, павысіць аб'ектыўнасць ацэнкі ведаў вучняў, узмацніць кантроль за вынікамі вучэбнай дзейнасці выпускнікоў», — адзначыў у сваім выступленні **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА**.

Прапануецца таксама захаваць тэсціраванне як асноўную форму правядзення ўступных выпрабаванняў у ВНУ. У той жа час не выключаецца ўнутраны экзамен па профільным прадмеце ў ВНУ пры паступленні на асобныя спецыяльнасці (творчыя, сельскагаспадарчыя, педагагічныя і іншыя), а таксама такі экзамен можа быць уведзены дадаткова для абітурыентаў, што паступаюць на спецыяльнасці на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі.

Як падкрэсліў Ігар Карпенка, дадзены падыход цалкам апраўданы, паколькі тэсціраванне з'яўляецца найбольш аб'ектыўным і непрадузятым спосабам ацэнкі ведаў абітурыентаў і цалкам выключае карупцыйны фактар. Пры гэтым захаванне ўнутранага экзамену мэтазгоднае з улікам таго, што ацэньванне ведаў пры тэсціраванні носіць абязлічаны характар і не дазваляе выявіць індывідуальныя здольнасці абітурыентаў, неабходныя ім пры навучанні па асобных спецыяльнасцях, такіх як журналістыка, архітэктура, педагогіка, творчасць, дызайн і іншых.

Акрамя таго, уносяцца прапановы аб правядзенні ўнутрыўніверсітэцкіх алімпіяд і залічэнні іх пераможцаў без уступных іспытаў у ВНУ.

Сярод ключавых новаўвядзенняў у новай рэдакцыі Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, прапанаваных Міністэрствам адукацыі, — увядзенне дыстанцыйнага навучання як самастойнай формы атрымання адукацыі, устанаўленне прынцыпу абавязковасці атрымання агульнай сярэдняй адукацыі, прадастаўленне магчымасці мэтавай падрыхтоўкі кадраў для арганізацый, размешчаных у населеных пунктах незалежна ад колькасці жыхароў (раней «мэтавікаў» можна было рыхтаваць толькі для населеных пунктаў з колькасцю насельніцтва не больш за 20 тысяч чалавек), надаванне статусу маладога спецыяліста выпускнікам, якія атрымалі адукацыю на ўмовах аплаты і выказалі жаданне атрымаць размеркаванне на першае рабочае месца.

«Увядзенне апошняй нормы створыць роўныя магчымасці для тых, хто навучаўся за кошт сродкаў бюджэту і на ўмовах аплаты. Гэта гарантаванае рабочае месца на час адпрацоўкі па размеркаванні, грашовая кампенсацыя ў сувязі з пераездам на месца работы, аднаразовая дапамога ў памеры аклады пры працаўладкаванні на першае рабочае месца, штомесячныя выплаты маладому спецыялісту на працягу тэрміну абавязковай работы па размеркаванні да 30 працэнтаў ад аклады, а для выпускнікоў з кола адораных і таленавітай моладзі — да 50 працэнтаў. З іншага боку, дзяржава таксама атрымае пэўны эфект. Гэта будзе садзейнічаць зніжэнню беспрацоўя сярод моладзі і замацаванню маладых кадраў на рабочым месцы», — рэзюмаваў Ігар Карпенка.

«Прапановы Міністэрства адукацыі неаднаразова разглядаліся ва ўрадзе, на пасяджэнні рэспубліканскага савета рэктараў, нарадах з удзелам рознага кола зацікаўленых. Таксама ў чэрвені гэтага года прайшлі парламенцкія слуханні на тэму «Нацыянальная сістэма адукацыі: стан, заканадаўчае рэгуляванне, шляхі ўдасканалення». Такім чынам, выпрацаваныя падыходы да ўдасканалення сістэмы адукацыі ўжо дастаткова вывераныя, комплексна прапрацаваны і падтрыманы не толькі педагагічнай супольнасцю, але і шырокім колам грамадскасці», — падкрэсліў кіраўнік урада.

Раман Галоўчанка адзначыў, што калі на рэспубліканскім педсавеце Прэзідэнтам будуць падтрыманы прапановы па ўдасканаленні сістэмы адукацыі, то ўсе змяненні ўвойдуць у сілу да 1 верасня 2022 года.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Меркаванні і ўражанні

«ДАРМАВОГА НІЧОГА НЕ БЫЛО І НЕ БУДЗЕ»

Уладзімір ГАЎРЫЛОВІЧ, старшыня Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі:

— Слухаў і глядзеў трансляцыю «Вялікай размовы з Прэзідэнтам», а згадваліся гарачыя падзеі жніўня 2020-га. Але не тыя, што адбываліся ў Мінску (мы яшчэ не да канца зразумелі, а што ж там адбывалася і чаму?). Згадвалася палеская глыбінка. Вёска. На полі — вялікі ўраджай, і яго трэба, нягледзячы на пандэмію, сабраць. Каб той жа Мінск пасля неразумнага сноўдання асобных «пакрыўджаных» па вуліцах, ці Гомель, дзе таксама былі на прыступках цырка ці ўнівермага групкі «бедных» студэнтаў, не засталіся без малака, хлеба і бульбы.

І я не бачыў ніводнага не занятага справай палешука. Усе ў тыя дні працавалі, не складаючы рук. Хто на грамадскім палетку, а хто на ўласнай сядзібе. Дзеля таго, каб накарміць сваю сям'ю і сваю краіну. Ім, сапраўдным стваральнікам народнага дабрабыту, было не да вылезлых «рэвалюцыянераў», не да тых, хто распальваў інфармацыйную вайну. Менавіта ж яны, хлебаробы, што жывуць з мазаля, падтрымалі законныя дзеянні ўлады, праваахоўных органаў па навядзенні парадку ў нашай міралюбівай і такой шматпакутнай, шматнацыянальнай краіне. Вось тады я не раз чуў ад сваіх землякоў-палешукоў: «Не падабаецца — ніхто цябе тут не трымае, едзь у еўрапейскія далі за абяцанымі смакоткамі, а нам, беларусам, не перашкаджай жыць і працаваць!»

Я падзяляю пункт гледжання Аляксандра Лукашэнкі: каб нешта мець, трэба старанна працаваць. Дармавога нічога не было і не будзе. Берагчы сваю краіну, яе незалежнасць ад знешніх нападкаў і ад унутраных адшчапенцаў. Умацоўваць сваю эканоміку. Цесна супрацоўнічаць з Расіяй, Кітаем, з тымі краінамі, якія нас падтрымліваюць словам і справай, імкнуцца адраджаць славянскае братэрства, наколькі рэальнасць дае нам такія магчымасці. Мы — дружалюбная краіна.

Але ўсё гэта будзе непатрэбнае, калі мы не зможам годна выхоўваць сваіх дзяцей. Як патрыётаў сваёй зямлі. Найперш увагу — ім, нашай будучыні. Не магу не пагадзіцца з Прэзідэнтам: «Па-мойму, пакаленне сучаснай моладзі многага не бачыць і не разумее. Ім патрэбна даносіць, растлумачваць, каб раслі з разуменнем, на якой зямлі жывуць, якія каштоўнасці ім імкнуцца прывіць у інтэрнэце».

Не вырашым праблемы ў адукацыйнай прасторы — не адолеем ніводнай грамадскай праблемы. На мой погляд, выхаваўчы аспект з шырокім прыцягненнем найперш сям'і павінен быць пастаўлены вышэй, чым толькі «аказанне адукацыйных паслуг», што мы маем сёння. І — балючая праблема падручнікаў. Нам трэба адказаць на пытанне: чаму мы іх, адпаведных запатрабаванням часу, дагэтуль не маем? Ці, можа, іх распрацоўкай займаюцца не тыя людзі? Сапраўды своечасова пастаўлена пытанне: чаму ў асобу ўкладаюцца дзяржаўныя сродкі, а яна, гэтая асоба, адплачвае здрадай?

На мой погляд, шматгадзінная размова кіраўніка дзяржавы з работнікамі масмедыя зусім не нагадвала звычайную прэс-канферэнцыю: гэта і па сваім фармаце, і па сутнасці была вялікая размова законна абранага лідара з усім беларускім народам, бо ў ёй, як у люстэрку, адбівалася тое, што ў нашай, абложанай «санкцыйнымі падарункамі» краіне адбываецца насамрэч, ад чаго нам трэба тэрмінова пазбаўляцца і што набываць. У чарговы раз кіраўнік беларускай дзяржавы паказаў, наколькі балючыя для яго асабіста тэмы, якія хвалююць кожнага беларуса, кожнага грамадзяніна краіны. З гэтай размовы кожны з нас павінен вынесці: усё мы вырашым мірным шляхам, мы здольныя плённа развівацца як нацыя, рэалізоўваць сябе і свае ідэі.

«ЗАКУПІМ УСЁ, ШТО ВЫРАСЛА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Вялікія партыі звычайна паступаюць з дакументамі: праверку тыя, хто здае, праводзяць самастойна. Калі ж партыі маленькія (як правіла, ад насельніцтва), правяраем у лабараторыі самі, — растлумачылі мне.

Такім чынам, здаць можна што заўгодна. Што ж здаюць?

— Садовыя ягады ў асноўным ужо адышлі, — тлумачыць Іосіф Баляславіч. — Цяпер у асноўным здаюць лісічкі і чарніцы. Сёння здалі садовыя буякі. Бліжэй да восені насельніцтва пачне актыўна здаваць бульбу, капусту, моркву, буракі, цыбулю, часнок, яблычны апад. Восень — сезон грыбоў, мёду, арэхаў, фасолі, гарбузовых семачак і журавін. А цяпер якраз заціша. У дзень здае сельгаспрадукцыю чалавек 10–15, не больш.

Яблычны апад — тое, што нарыхтоўшчыкі бяруць без абмежаванняў, як і ягады, грыбы. З абмежаваннямі прымаецца плодаагароднінная прадукцыя, якую трэба прадаць адразу ж. Яна рэалізоўваецца праз гандлёвую сетку райспажыўтаварыства.

ЧАРНІЦЫ Ў ЦАНЕ

Закупачныя цэны фарміруюцца штодня зыходзячы з попыту і прапановы — у залежнасці ад цэн, па якіх прадпрыемствы гатовыя набываць сельгаспрадукцыю на перапрацоўку.

— Цана мяняецца амаль кожны дзень, — распавядае Іосіф Шустал. — Калі, дапусцім, прадпрыемства гатовае закупляць сыравіну па 30 капеек за кілаграм, мы закупляем яе ў насельніцтва па 20–25 капеек. Нядаўна лісічкі мы прымалі па 8 рублёў за кілаграм, цяпер прайшлі дажджы і цана ўпала да 6 рублёў за кіло. Яблык-апад мы пачыналі прымаць па 15 капеек за кілаграм. Заводы пакуль не даюць цану больш як 18–20 капеек. Калі закупкі не будзе, падымем закупачную цану і будзем шукаць прадпрыемствы, што згодныя будуць набыць сыравіну даражэй. Сёлета з прапановай складана, а попыт ёсць.

Клубніцы ў гэтым годзе людзі здавалі дастаткова ахвотна. Хоць і гэтых ягад у параўнанні з мінулымі гадамі вырасла мала.

— Клубніцы мы пачыналі прымаць па 8-9 рублёў, а заканчвалі — па 3 з паловай — 4 рублі за кілаграм. Каля 90 % клубніц (каля 12 тон) прадалі ў розніцу праз нашу гандлёвую сетку. Прыкладна 10 % здалі на вінна-гарэлачныя заводы ў якасці сыравіны.

Нарыхтоўвалі ў пачатку сезона і зяленіва — на яго быў вялікі попыт. Зялёная цыбуля, кроп і пятрушка прадаваліся ў розніцу і закупляліся ў насельніцтва значна танней, чым прапаноўвалі цяплічныя камбінаты.

«З гнілога яблыка не зробіш ні якаснага соку, ні віна. А тыя ж агуркі кансервавыя заводы бяруць толькі даўжынёй 8-9 см, не больш. У слоіку агурок выдатна бачны, і калі ён не прыгожы, такі слоік проста не купяць. Плады, што перараслі ці проста непрыгожай формы, па стандарце не праходзяць, і мы іх не прымаем».

Намеснік старшыні Баранавіцкага райспажыўтаварыства па нарыхтоўках, вытворчасці і знешнеэканамічнай дзейнасці Іосіф ШУСТАЛ паказвае, якія лісічкі ахвотна забіраюць на экспарт.

Цяпер сезон садовых буякоў (іх нарыхтоўшчыкі прымаюць па 6,5 рубля, а прадаюць праз гандлёвую сетку па 8,5). А ў лясах — сезон чарніц. Але на чарніцы гэты год таксама неўраджайны.

— Таму і цана высокая. Такой цаны на чарніцы, як сёлета, не было за ўсе гады, якія я працую. Гэтым летам цана даходзіць да 8 рублёў за кілаграм, а ў ранейшыя гады яна не падымалася вышэй за 5 рублёў. Фарміруюць цану закупкі, дарэчы, не толькі наш рэгіён, але і Еўропа, Расія, Украіна — там на нашы чарніцы ёсць попыт.

— Чырвоных парэчак у гэтым годзе таксама закупілі вельмі мала. У мінулыя гады нарыхтоўвалі па 30–50 тон, — кажа спецыяліст.

Нарыхтоўшчыца Баранавіцкага райспажыўтаварыства Зінаіда МЯЛІК: на дзень тут бывае чалавек 10 наведвальнікаў.

Калі год неўрадлівы, закупачныя цэны паўзуць уверх.

— Цяпер маслякі пайшлі, мы прымаем іх па рубель пяцьдзясят за кілаграм. Летась самай высокай цаной была «рубель дваццаць». У нашага райспажыўтаварыства ёсць грыбаварныя пункты, і на кансервавыя заводы мы масляты і апенькі рэалізоўваем у выглядзе паўфабрыкату — адварныя, з соллю і спецыямі. Яны дадаюць іх у салянкі. Лісічкі рэалізоўваем у розніцу (12 рублёў кілаграм) або замарожваем. Баравікі будзем нарыхтоўваць бліжэй да восені — калі, вядома, пройдзе дастаткова дажджоў і ў лясах з'явіцца хоць нейкі іх ураджай. Летась першым сортам яны прымаліся па 6 рублёў за кілаграм, другім — па 3-4 рублі. У гэтым, мяркую, закупачныя цэны будуць вышэйшыя.

«НЕКАНДЫЦЫЯ» НЕ ПРОЙДЗЕ

Як ужо гаварылася, большая частка «ўлову» нарыхтоўшчыкаў ідзе на перапрацоўку — больш за 70 %. Сталыя партнёры Баранавіцкага райспажыўтаварыства — Ляхавіцкі кансервавы завод, «Гама смаку» (Клецк), кансервавы завод у Стоўбцах, філіял цукровага завода ў Гарадзеі, Слонімскі вінзавод, «Белавежскія віны» ў Пружанах.

— Яблыкі ідуць на перапрацоўку практычна цалкам, агуркі-памідоры — толькі 7–10 працэнтаў: кансервавыя заводы закупляюць на кансервацыю ў слоіках. Але калі цэны высокія, яны з намі не працуюць, бяруць, толькі калі цэны падаюць, — тлумачыць намеснік старшыні.

Існуе меркаванне, што на перапрацоўку можна выкарыстоўваць любую «некандыцыю», амаль што гніллё. Але гэта не так, кажуць нарыхтоўшчыкі. Да прадукцыі — досыць высокія патрабаванні.

— З гнілога яблыка не зробіш ні якаснага соку, ні віна. А тыя ж агуркі кансервавыя заводы бяруць толькі даўжынёй 8-9 см, не больш. У слоіку агурок выдатна бачны, і калі ён не прыгожы, такі слоік проста не купяць. Плады, што перараслі ці проста непрыгожай формы, па стандарце не праходзяць, і мы іх не прымаем. Ведаю, што «некандыцыя» выкарыстоўваецца на корм скаціне — каровам, свінням. А на вараных насенных агурках выдатна растуць качкі, — распавялі фермеры ў Пінску. Але да нас гэта ўжо адносін не мае.

ЦІ ГЭТА ВЫГАДНА?

Зарабіць на здачы сельгаспрадукцыі ў нарыхтоўчыя пункты сёлета цалкам рэальна, адзначае суразмоўнік: закупачныя цэны па многіх пазіцыях гэта дазваляюць. І многія спрабуюць.

— У нас па выхадных электрычкі прыгарадныя перапоўненыя — людзі едуць у ягады. 10 кілаграмаў сабраў — атрымаў 70–80 рублёў. Тым больш цяпер дазволена збіраць камбайнам. Раней мы не прымалі ягаду з лісцем, цяпер прымаем.

Камбайны для збору ягад, вядома, наносяць шкоду чарнічніку, але ў разы паскараюць працэс збірання ягад. Дарэчы, на нарыхтоўчым пункце можна атрымаць за здадзеную прадукцыю не толькі грошы. Можна «памяняцца» на тое, у чым адчуваецца недахоп у гаспадарцы. Напрыклад, па жаданні, здаўшы пэўную колькасць садовых буякоў, можна атрымаць замест грошай пэўную колькасць дарожных лесу (грыбоў або чарніц) і наадварот.

Рэалізоўвае чарніцы і лісічкі Баранавіцкае райспажыўтаварыства ў тым ліку і ў Расію, Прыбалтыку, краіны Заходняй Еўропы.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, фота аўтара.

Цяпер — сезон садовых буякоў, чарніц і лісічак.

Перспектыўны напрамак

БЕЛАРУСЫ АРЫЕНТАВАНЫЯ НА ЎНУТРАНЫ ТУРЫЗМ

Паляўнічы турызм стаў больш запатрабаваны сярод беларусаў. Пра гэта расказаў начальнік аддзела паляўнічай гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі Аляксандр КАЗАРЭЗ.

— Сітуацыя з пандэміяй унесла ў паляўнічы турызм пэўныя карэктывы — як адмоўныя, так і станоўчыя. Ён у нас рэзка скараціўся і можна сказаць, што пакуль стаіць на паўзе. Хоць усе нашы карыстальнікі паляўнічых угоддзяў і базы гатовыя прымаць гасцей. У той жа час, у сувязі са складанай арганізацыяй адпачынку за мяжой беларусы сталі праяўляць большую цікавасць да гэтага спосабу адпачынку. Так, у 2019 годзе на ўнутраным паляўнічым турызме мы зарабілі звыш 18 мільёнаў рублёў, у 2020-м — больш за 22,5 мільёна. Калі ў сярэднім у нас з'яўлялася ў год прыкладна 1,1—1,2 тысячы новых паляўнічых, то летась да гэтай лічбы дадалося яшчэ 700–800.

Акрамя таго, актывізаваўся ўнутраны экалагічны турызм. Раней нямногія прыязджалі ў нашы паляўнічыя комплексы і наведвалі экалагічныя сцежкі. Цяпер паток людзей сапраўды вялікі. У выхадныя дні экасцежкі наведваюць ад 100 да 1,5 тысячы чалавек, а паляўнічыя комплексы забраніраваны да канца года. Дзесьці мы не чакалі такога наплыву, але нашы лесагаспадарчыя, прыродаахоўныя ўстановы набралі абароты і гатовыя прымаць такую колькасць турыстаў.

Аляксандр Казарэз дадаў, што ў сістэме Мінлясгаса цяпер дзейнічаюць 75 лесапаляўнічых гаспадарак. «У кожнай з іх ёсць паляўнічы комплекс, у некаторых — па два. Мы не настроеныя на будаўніцтва новых аб'ектаў. На наш погляд, кожны павінен займацца сваёй справай, таму па пытаннях арганізацыі быту значна больш эфектыўна ўзаемадзейнічаем з партнёрамі з аграсядзіб, якіх па краіне вельмі шмат», — расказаў ён.

Старшыня праўлення БГА «Адпачынак у вёсцы» Валерыя КЛІЦУНОВА дадала, што сёння папулярны культурна-пазнавальны, экалагічны, аграэкатурызм. «Летась унутраны турызм аказаўся больш запатрабаваны, чым выязны, у 2,5 раза. Таксама павялічылася колькасць арганізацый, якія займаюцца ўнутраным турызмам, што, безумоўна, радуе».

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Па-людску

Бусел у мазутным палоне

Знаходзячыся на чарговым дзяжурстве, падчас абходу тэрыторыі супрацоўніца Дэпартамента аховы звярнула ўвагу на рух у рэзервуары з адходамі нафтапрадуктаў.

Як высветлілася, у мазуце апынуўся белы бусел, які на момант выяўлення цалкам заграз у вязкай масе, стаўшы чорнага колеру, паведамляе МУС.

Прапаршчык міліцыі Аксана Даніловіч не разгубілася і вокамгненна пачала выратавальную аперацыю: дацягнулася да крыла птушкі і дапамагла ёй рушыць да краю рэзервуара.

Каб бусел не загінуў, супрацоўніца аднесла яго ў лабараторыю, дзе разам з работнікамі прадпрыемства ўдалося адмыць небараку ад ліпкай субстанцыі. Змораная і знясіленая птушка нават не супраціўлялася.

Спачатку бусла перадалі ў прыватны прытулак для пацярпелых жывёлін «Астравок у Рэчыцы», дзе яму аказалі кваліфікаваную дапамогу. А пасля выратаваны пераехаў у прыватную ўстанову «Ахова прыроды», размешчаную ў Асіповічах, якая дапамагае дзікім птушкам, што трапілі ў бяду. У дадзены момант жыццю бусла нічога не пагражае.

Па словах дырэктара прытулку Жанны Сталяровай, яму спатрэбіцца каля чатырох гадоў, каб прыйсці ў былую форму, змяніць апярэнне і вярнуцца ў натуральнае асяроддзе пражывання, цытуе МУС.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Мы разам — Беларусь!

Краіна моцная рэгіёнамі: Кобрынскі раён

ІНВЕСТАР У ГЛЫБІНЦЫ І САЦЫЯЛЬНЫЯ ПРАЕКТЫ

Па выніках работы за мінулы год у галіне сацыяльна-эканамічнага развіцця Кобрынскі раён занесены на Рэспубліканскую дошку гонару. Пра гэта і не толькі, а таксама аб надзённых праблемах і важных дасягненнях — наша сённяшняя размова са старшынёй Кобрынскага райвыканкама Міхаілам ГРЫШКЕВІЧАМ.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

І на пачатку размовы Міхаіл Міхайлавіч скарыстаўся магчымасцю падзякаваць праз газету ўсіх працаўнікоў за работу на працягу мінулага года, якая дала добрыя вынікі і была заўважана на ўзроўні краіны.

— Перш за ўсё хочацца добрым словам адзначыць нашых медыкаў, якія ўжо другі год стаяць на перадавой аховы здароўя, а заадно і паўшчуваць грамадства, якое не праяўляе належную свядомасць і не вельмі актыўна робіць прышчэпкі, — гаворыць кіраўнік раёна. —Усе вядомыя ў свеце эпідэміі былі спынены шырокай кампаніяй вакцынацыі. Так і цяпер, мы зможам зберагчы сябе і хоць крышку знізіць нагрузку на медыцыну, калі актыўна будзем прышчапляцца. Напрыклад, я і мая сям'я ўжо зрабілі прышчэпкі, хоць раней і перахварэлі. Аб гэтым заўсёды гавару ў працоўных калектывах, заклікаю людзей да свядомасці. Сёння барацьба з небяспечнай хваробай азначае велізарныя выдаткі, і не толькі фінансавыя. Гэта мы адчуваем нават на ўзроўні раёна.

— Ва ўмовах пандэміі жывём другі год. Якія ўрокі вынесены, на ваш погляд, на ўзроўні раёна, на што варта звярнуць увагу ў будучым?

— Дасягненнем лічу набыццё апарата КТ для нашай цэнтральнай раённай бальніцы. У раёне 83 тысячы насельніцтва, а свайго апарата камп'ютарнай тамаграфіі раней не было. Хворых трэба было вазіць на КТ у Драгічын альбо Брэст. І гэта не толькі датычыцца цяперашняй сітуацыі з ковідам, апарат патрэбны для паспяховай дыягностыкі ва ўсіх аддзяленнях. Як, дарэчы, і апарат МРТ, які плануем недзе праз год набыць і ўсталяваць у бальніцы. Сёння без названай апаратуры нельга аказваць якасную кваліфікаваную медыцынскую дапамогу. І гэта, можа, нават важнейшае за рамонт і рэканструкцыя моста ў райцэнтры, якія на слыху ў кожнага гараджаніна.

— Калі ўжо згадалі пра мост, якія яшчэ праекты ў сацыяльнай сферы сёння на парадку дня?

— Так, мост, які ў народзе называюць Новым, перажывае рамонт і рэканструкцыю другі год. Калі ўсё будзе добра, недзе да канца года плануем работу завяршыць.

Пачалася работа на будаўнічай пляцоўцы новай школы-садка на 471 месца, налета да 1 верасня ўстанова адукацыі павінна быць уведзена ў строй. Вялікая работа намечана па рэканструкцыі дзіцячай бальніцы, рамонце радзільнага дома. Ёсць план па паляпшэнні базы, добраўпарадкаванні, рамонце ФАПаў. Адным словам, галіна аховы здароўя раёна ў бліжэйшыя гады выйдзе на новы ўзровень. А для гэтага павінны зладжана працаваць усе галіны эканомікі.

— Акрамя традыцыйных аграрных, прамысловых прадпрыемстваў, якія ўстойліва функцыянуюць, каго можна назваць драйверамі росту на Кобрыншчыне? Як развіваецца прыватны бізнес?

— У глыбінцы, на месцах мы ўжо бачым, што будучыня за невялікімі прадпрыемствамі — ад 50 да 150–200 працаўнікоў. Зусім хутка запрацуе адно такое на поўдзень ад Кобрына — БТВ «Агра» — прадпрыемства па вырошчванні грыбніц. Прыватны інвестар прыйшоў у раён і стварыў вялікую імпартазамяшчальную вытворчасць, якае будзе эканамічна ўзаемадзейнічаць з мясцовымі сельгаспрадпрыемствамі. Тут створана прыкладна 65 рабочых месцаў. Побач з названым БТВ паспяхова працуе прыватная кампанія па перапрацоўцы рыбы, якая ўстойліва развіваецца і мае намер пашыраць бізнес. Можна сказаць і пра Кобрынскую птушкафабрыку, якая шмат гадоў была стратнай. Знайшоўся інвестар, што набыў прадпрыемства, і справы пайшлі на лад. Важна, што новы гаспадар захаваў калектыў, уклаў сродкі, ажывіў вытворчасць, сёння птушкафабрыка працуе, дае прадукцыю. Па выніках паўгоддзя ў іх назіраецца стабільны рост. На перспектыву яны плануюць мадэрнізацыю вытворчасці і далейшае пашырэнне.

Будзем працаваць над тым, каб бізнес рухаўся менавіта ў глыбінку, у сельскую мясцовасць. Рэзерваў шмат. Вось, скажам, вялікі населены пункт Тэўлі, а бізнесу там амаль няма. Хоць з усіх бакоў выгаднае геаграфічнае становішча, ёсць буйная чыгуначная станцыя. Нядаўна там зарэгістравана адно прадпрыемства, на мой погляд, даволі перспектыўнае. Будзем спадзявацца, што першая ластаўка стане прыкладам для іншых.

— Едучы да вас, назірала, якая работа ідзе на палях, у асноўным ужо вядзецца ворыва пасля жніва. Уборка збожжавых падыходзіць да фіналу?

— Так, сабрана з палёў прыкладна 75 працэнтаў збожжавых, засталося адпаведна 25 працэнтаў. І гэтыя

«Будзем працаваць над тым, каб бізнес рухаўся менавіта ў глыбінку, у сельскую мясцовасць. Рэзерваў шмат».

астатнія, нібы ў таго спартсмена фінішная дыстанцыя, аказаліся самыя цяжкія. Бо ідуць дажджы, перыядычна здараюцца прастоі не па віне аграрыяў. Але ж работа працягваецца. Усё, што залежыць ад нас, мы зрабілі: маю на ўвазе, найперш, наяўнасць кадраў, забеспячэнне палівам, падрыхтоўка тэхнікі. Зараз застаецца падладжвацца пад надвор'е, каб усё вырашчанае было сабрана.

Назваць гэты сельскагаспадарчы год неардынарным не выходзіць. Цяпер усе гады такія — то засушыць, то залье, таму што нашу зону рызыкоўнага земляробства не адменіш. Неабходна працаваць над тэхналогіямі, разглядаць сартавы, відавы склад будучых пасеваў, каб мінімізаваць наступствы любых капрызаў надвор'я. А гэта ўжо зона адказнасці спецыялістаў і кіраўнікоў гаспадарак.

— Ведаю, што падбору і выхаванню кіруючых кадраў вы ўдзяляеце асаблівую ўвагу...

— Здольны, таленавіты кіраўнік — гэта знаходка для любога прадпрыемства, калі хочаце, яго ўзнагарода. Сёння кіраўнік — гэта не проста менеджар, гэта генератар ідэй, аналітык эканомікі, праваднік новых тэхналогій і кірункаў. Цяпер асабліва ўзрастае роля кіраўніка, калі мы працуем ва ўмовах пандэміі, санкцыйнай палітыкі. Тыя прадпрыемствы, дзе сістэма кіравання гнуткая, а не закасцянелая, працуюць і развіваюцца. У нас ёсць кіраўнікі шаноўнага ўзросту, якія просяцца на пенсію, а мы іх усяляк стараемся ўтрымаць. Кіраўніка так проста не заменіш, яго трэба гадаваць, выхоўваць. На шчасце, такія ў раёне ёсць, маладым ёсць на каго раўняцца. Цікава працуюць асобныя старшыні сельскіх Саветаў. Дарэчы, сёння (9 жніўня. — **Аўт.**) праводзім атэстацыю групы кіраўнікоў, сярод іх ёсць і старшыні сельвыканкамаў, будзем гаварыць аб надзённым, аб рабоце з людзьмі, добраўпарадкаванні сельскіх тэрыторый.

— У плане добраўпарадкавання — якія значныя праекты ажыццёўлены за апошнія гады?

— Работа вядзецца, будуюцца і паляпшаюцца дарогі, вы ж бачылі, калі праязджалі. Асвойваем новыя пляцоўкі для ўзвядзення індывідуальнага жылля. Але найбольшым праектам, можна сказаць, праектам пяцігодкі, стала добраўпарадкаванне і ўладкаванне вёскі Дзівін. Былое мястэчка выглядала забытым у апошнія дзесяцігоддзі. А да «Дажынак» 2020 года населены пункт, дзе пражывае каля трох тысяч чалавек, стала літаральна не пазнаць. Вёска атрымала новы імпульс, цяпер стаіць задача падтрымліваць і развіваць зробленае. Наогул, сацыяльны праект дзяржавы пад назвай «Дажынкі» сябе апраўдвае, гэта вельмі добрая практыка падтрымкі невялікіх населеных пунктаў у глыбінцы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Ахова здароўя

НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ

Бальніца атрымала апарат камп'ютарнай дыягностыкі

Сапраўдным прарывам у справе дыягностыкі кобрынскія медыкі называюць набыццё апарата КТ для цэнтральнай раённай бальніцы. Тамограф маркі Siemens набыты ў пачатку года за кошт пазыкі Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця для барацьбы з COVID-19. Кошт яго склаў 770 тысяч рублёў. Яшчэ 660 тысяч рублёў выдзеліў мясцовы бюджэт на рэканструкцыю памяшкання для ўстаноўкі абсталявання. Апаратура актыўна і паспяхова эксплуатуецца ўжо некалькі месяцаў.

Загадчыца рэнтгеналагічнага аддзялення бальніцы Святлана ЯКАЎЧУК расказала, што на апараце працуе адзін урач райбальніцы і два сумяшчальнікі з Брэста і Драгічына. Кадраў дастаткова, каб забяспечыць пастаяннае задзейнічанне сучаснай апаратуры.

— Цяпер на змену праводзіцца да 20 даследаванняў, — гаворыць Святлана Аляксандраўна. — Для хворых з каранавіруснай інфекцыяй выдзелены асобныя змены для таго, каб яны не перасякаліся з іншымі пацыентамі. У астатні час дыягностыку праходзяць пацыенты ўсіх аддзяленняў бальніцы. Камп'ютарны тамограф дазваляе ўбачыць увесь арганізм, апарат робіць больш за 60 зрэзаў. Урач мае магчымасць устанавіць дакладную лакалізацыю пашкоджанняў, гэта рынцыпова новы ўзровень дыягностыкі. У доктара з'явілася магчымасць паставіць дыягназ на ранняй стадыі захворвання.

З установкай апарата КТ сталі паступаць просьбы пацыентаў аб арганізацыі платных даследаванняў. Цяпер такая магчымасць ёсць. У кожную змену выдзяляюцца адно-два месцы для прыёму на платнай аснове. Вядзецца далейшая арганізацыйная работа. Хутка пачнём прымаць пацыентаў з Маларыцкага і Пружанскага раёнаў, — паведаміла Святлана Якаўчук.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота БелТА.

Культура

«АРЫФМЕТЫКА» МАГНІЦКАГА І ТАВАРЫШ МАЎЗЕР

Кобрынскі ваенна-гістарычны музей на працягу года рэалізуе цікавы асветніцкі праект



Фота Алены ДАЎКАНОК.

Ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава сёлета адзначае сваё 75-годдзе. Да юбілейнай даты музей падрыхтаваў цыкл выстаў аднаго прадмета «Экспанат для цікаўных, альбо З тайнікоў музея». Кожны месяц ладзіцца новая выстава з музейнага фонду, на агляд выстаўляецца прадмет, які раней ніколі не экспанаваўся. Артэфакт з'яўляецца ў апошняй зале экспазіцыі.

Паводле інфармацыі **дырэктара ўстановы Алены БАБЕНКА,** ідэю запазычылі ў абласнога краязнаўчага музея. Вырашылі прыцягнуць увагу да сваіх фондаў, якія налічваюць 25 тысяч прадметаў, у той час як у пастаянных экспазіцыях выстаўлена ўсяго каля трох тысяч экспанатаў. Ды ў музея ёсць такія прадметы, што не ўпісваюцца ў тэматыку экспазіцый, але ж уяўляюць сабой гістарычную рэдкасць і каштоўнасць. Вось іх і прэзентуюць зараз наведвальнікам.

І першым такім рарытэтам стала брашура «Біяграфічныя звесткі аб службе вялікага палкаводца», якая была выдадзеная ў Ленінградзе ў 1940-м годзе. Унікальнасць кнігі ў тым, што яна была падорана кобрынскаму музею аўтарам-укладальнікам, кандыдатам гістарычных навук Ціханам Вараб'ёвым, аб чым сведчыць надпіс. Былі выстаўлены таксама крэсла эпохі Рэнесансу, каўнер для параднага мундзіра вялікага князя Міхаіла Паўлавіча, брата імператара Аляксандра I.

А вось «Арыфметыка» Магніцкага — кніга ва ўсіх сэнсах унікальная. Выдадзены ў Маскве ў 1703 годзе, гэта

першы ў Расіі падручнік па матэматыцы. Кніга набраная кірыліцай, упрыгожана гравюрамі, тэкст праілюстраваны малюнкамі і чарцяжамі, ёсць нават вершаваныя ўстаўкі. Больш за паўстагоддзя расійскія навучальныя ўстановы выкарыстоўвалі гэтую кнігу ў якасці падручніка. Ламаносаў называў «Арыфметыку» Магніцкага і «Граматыку» Сматрыцкага «брамай сваёй вучонасці».

А героем дня ў маі на гэтай выставе стаў пісталет сістэмы «Маўзер К96». Маўзер зрабілі ў канцы XIX стагоддзя ў Германіі, вытворчасць яго працягвалася да 1939 года. У якасці асабістай зброі пісталет у свой час мелі Уінстан Чэрчыль, савецкія военачальнікі Клім Варашылаў, Сямён Будзённы. «Таварыш Маўзер» з'яўляецца амаль ва ўсіх савецкіх фільмах пра рэвалюцыю і грамадзянскую вайну. З ім ходзяць героі «Няўлоўных мсціўцаў», «Белага сонца пустыні», «Афіцэраў».

Арыгінальны маўзер узору 1912 года перадаў музею ветэран Вялікай Айчыннай вайны, ганаровы грамадзянін Кобрына, камандзір палка, які вызваляў Кобрын у 1944-м, палкоўнік Дзмітрый Барысаў. У музеі захоўваюцца ўспаміны Дзмітрыя Барысавіча. Ёсць здымак, які ўвекавечыў момант перадачы зброі ветэранам Барысавым тагачаснаму дырэктару музея Аляксею Мартынаву. Было гэта ў 1974 годзе на святкаванні 30-годдзя вызвалення Кобрына.

Экспанатам жніўня стаў гіпсавы бюст хлопчыка работы вядомага скульптара Бальбіны Свіціч-Відацкай, якая да вайны жыла ў Кобрыне. Дарэчы, Бальбіна Відацкая — аўтар бюста Тадэвуша Касцюшкі, які знаходзіцца ў вёсцы Сяхновічы Жабінкаўскага раёна, на месцы радавога маёнтка Касцюшкаў.

Яна СВЕТАВА.
Фота з сайта музея.

ЗАВОД І ЛЮДЗІ

Працоўныя дынастыі на Грушаўскім РМЗ — норма, а не выключэнне

Кобрынскі раён славіцца дубровамі. Самыя старадаўнія дубы ахоўваюцца дзяржавай — і, як людзям, ім даюць імёны. Дуб-волат з імем Дывайтыс ёсць і ў вёсцы Грушава, яго дыяметр — большы за 2,5 м, а расце ён на гэтай зямлі паўтысячы гадоў. Яшчэ адна славутасць, якая робіць старадаўняе мястэчка вядомым, — Грушаўскі РМЗ: прадпрыемства, дзе выпрабляюцца меліярацыйнае абсталяванне, будаўнічыя металаканструкцыі, абсталяванне для арганізацый Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання.

Дырэктар ААТ «Грушаўскі РМЗ» Пётр ПАПРОЦКІ.

РМЗ пастаўляе прадукцыю амаль усім прадпрыемствам ДА «Белводгас».

Значэнне ААТ «Грушаўскі рамонтна-механічны завод» цяжка пераацаніць. У краіне ёсць рэгіёны, дзе абсалютная большасць сельскагаспадарчых угоддзяў знаходзіцца на меліяраваных землях. З часам меліярацыйнае абсталяванне, якое забяспечвае якасць гэтых зямель, становіцца непрыдатнае, і вырабіць замену або адрамантаваць установленыя яшчэ пры Савецкім Саюзе механізмы могуць толькі спецыялісты з Грушава.

— Наш завод займаецца вытворчасцю абсталявання для меліярацыйнай галіны, у тым ліку ўтрымліваючых ваду засавак і пад'ёмнікаў для гідрамеліярацыйных збудаванняў, — падкрэслівае **дырэктар ААТ «Грушаўскі РМЗ» Пётр ПАПРОЦКІ.**

На прадпрыемстве працуе ўсяго 68 чалавек, пры гэтым сфера адказнасці спецыялістаў Грушаўскага рамонтна-механічнага завода — уся краіна. РМЗ пастаўляе прадукцыю амаль усім прадпрыемствам ДА «Белводгас», аргазінацыям Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання і будаўнічым прадпрыемствам.

— Мы ведаем на памяць, дзе і якое «хворае месца» ў меліярацыйнай галіне краіны. Усе вобласці, усе прадпрыемствы меліярацыйных сістэм — нашы кліенты. Нашы засаўкі і пад'ёмнікі стаяць на большасці вадасховішчаў краіны — у тым ліку на Салігорскім вадасховішчы і Мінскім моры, забяспечваюць работу вяслярнага канала ў Заслаўі.

СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

У адкрытае акцыянернае таварыства Грушаўскі рамонтна-механічны завод быў пераўтвораны 29 снежня 2000 года. А сваю гісторыю прадпрыемства вядзе з далёкага 1944-га. Тады ў Грушаве было створана коннае дэпо, пераўтворанае ў 1953-м у машынна-трактарную станцыю, а ў 1963-м — у рамонтна-экскаватарную майстэрню Белгалоўмеліяводгаса. У сакавіку 1980 года загадам Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі СССР майстэрня была пераўтворана ў Грушаўскі рамонтна-механічны завод. Прадукцыю прадпрыемства выкарыстоўвалі меліярацыйна-будаўнічыя і эксплуатацыйныя арганізацыі Міністэрства меліярацыі БССР, арганізацыі Галоўпалессеводбуда.

Старшыня прафкама завода Міхаіл ДЗЕМІДЗЮК.

Галоўны бухгалтар Марыя АНТАНЮК.

— Так працягвалася да 1990 года, калі паступова заказы заводу на вытворчасць меліярацыйнага абсталявання пачалі падаць. І прадпрыемства вымушана было асвойваць вытворчасць новых відаў тавараў для іншых галін гаспадаркі.

Дыверсіфікацыя стала магчымасцю выжыць для ўнікальнага прадпрыемства. Сёння, акрамя асноўнага віду дзейнасці, Грушаўскі РМЗ вырабляе будаўнічыя металаканструкцыі, зборныя канструкцыі, займаецца дрэваапрацоўкай.

— Яшчэ з 1990-х дрэваапрацоўцы на нашым прадпрыемстве аддавалася асаблівая ўвага, — распавядае Пётр Папроцкі. — Вялікая работы па вытворчасці зборна-шчытавых дамоў, аконных і дзвярных блокаў, убудаванай мэблі, паганажных вырабаў. Запатрабаваныя механаапрацоўка і зварачная вытворчасць. Мы робім газаходы, бакі, абсталяванне для кацельняў і водонапорныя вежы. Па сутнасці, на прадпрыемстве могуць вырабіць любое нестандартнае абсталяванне, і гэта — той шлях, які дазваляе заводу заставацца на плаву.

Завод вядзе тэхнічнае пераўзбраенне: у прыватнасці, зварачны цэх абсталяваны ўстаноўкай для плазменнай рэзкі металу, якая дазволіла палепшыць якасць зварачных работ і напалову скараціць спажыванне электраэнергіі.

ПРАЦОЎНЫЯ ДЫНАСТЫІ

Пётр Папроцкі — ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна і вось ужо 23 гады — нязменны дырэктар Грушаўскага РМЗ. Поўны жстаж работы на родным прадпрыемстве ў дырэктара — большы за 40 гадоў. За гэты час Пётр Сяргеевіч зрабіў для сябе выснову: поспех любога прадпрыемства — людзі, якія ўмеюць і жадаюць працаваць. Таму трапіць на завод няпроста — бяруць толькі тых, хто дакажа свой прафесіяналізм. Грушаўскі РМЗ — адно з нешматлікіх прамысловых прадпрыемстваў, якія працуюць у сельскай мясцовасці, пры гэтым сярэдняя зарплата тут дастойная нават па мерках сталіцы — 1100–1200 рублёў. Актыўна працуе прафсаюзная арганізацыя, падтрымліваюцца шматдзетныя сем'і, работнікам аказваецца матэрыяльная дапамога. Арганізавана дастаўка работнікаў на работу заводскім транспартам.

— Нам патрэбныя будаўнікі, меліяратары, тэхнолагі, машынабудаўнікі — і ўсе гэтыя кваліфікацыі нашы супрацоўнікі павінны спалучаць у адной асобе. Тут і навучаем кадры. Людзі прыходзяць з агульнай прафільнай адукацыяй, а потым вучацца і асвойваюцца 3–4 гады, перш чым набыць неабходныя нам кваліфікацыі. Кажуць: «У вас ювелірная работа». Але ў нас яшчэ і небяспечная работа! Наша засаўка, напрыклад, важыць чатыры тоны, для яе вытворчасці неабходныя грузападзёмнае абсталяванне, зварачная апаратура, абсталяванне для афарбоўкі.

Слесар Аляксандр ВАЙТОВІЧ.

Маляр Андрэй МІЖЭЎСКІ.

І пры такіх габарытах значэнне маюць дробныя нюансы. Напрыклад, таўшчыня афарбоўкі: лішні міліметр — і абсталяванне доўга не праслужыць. А падфарбаваць яго ў вадзе ўжо амаль немагчыма. Ды і афарбоўка будаўнічых канструкцый, якія не маюць дачынення да меліярацыйнага абсталявання, патрабуе дакладнага вока і філіграннай работы.

Андрэй Міжэўскі кажа пра сябе сціпла: маляр. «На самай справе, работнікаў фарбавальнага цэха можна назваць мастакамі», — кажа дырэктар. Андрэй — малады спецыяліст, ездзіць працаваць у Грушава з суседняга аграгарадка Гарадзец.

Асаблівасць Грушаўскага РМЗ: працоўныя дынастыі тут норма, а не выключэнне з правілаў.

— У нас якое прозвішча ні вазьмі, працуюць сямейныя пары або бацька і сын. А часта бывае, што на заводзе працавалі яшчэ і дзед з бабуляй, — усміхаецца дырэктар.

Слесар Аляксандр Вайтовіч на Грушаўскім РМЗ ужо шмат гадоў. Дагэтуль тут працавалі яго бацька і дзед. А не так даўно на прадпрыемства прыйшоў працаваць і яго сын.

Пётр Сяргеевіч падкрэслівае, што калектыў на прадпрыемстве склаўся ідэальны — шмат моладзі, але шмат і ветэранаў, якія аддалі заводу не адзін дзясятак гадоў і гатовыя дзяліцца вопытам. Сярэдні ўзрост у калектыве — 45 гадоў, так што ў завода ёсць будучыня.

Слесар Іван КРАЎЧУК.

Фрэзероўшчык Віталь АЗАРЧУК.

Токар Іван КУЗЬМІЧ.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.
Фота аўтара і Алены ДАЎЖАНОК.

УНП 200041196

Зернесушыльны комплекс.

СТАЎКА НА ЯКАСЦЬ

Прынцып работы ААТ «Агра-Кобрынскае»

«АГРА-КОБРЫНСКАЕ» — невялікая гаспадарка: у яе 2392 гектары зямлі. Але ў рэгіёне на працягу 25 гадоў яна традыцыйна займае першыя месцы па ўраджайнасці. Ужо сёння гаспадарка ўбрала больш за палову збожжавых і зернебабовых, а ўраджайнасць, нягледзячы на засушлівыя чэрвень і ліпень, чакаецца на ўзроўні 62 цэнтнераў з гектара. Зразумела, справа і ў тым, што землі ААТ «Агра-Кобрынскае» маюць высокую бальнасць. Але ў першую чаргу, лічаць тут, поспехам гаспадарка абавязаная камандзе прафесіяналаў — людзей, улюбёных у сваю справу.

Дырэктар ААТ «Агра-Кобрынскае» Сяргей СЕЛІВЕСТРАЎ і механізатар 1-га класа Міхаіл ЗАЯЦ.

Галоўны эканаміст Надзея АРАБКА і намеснік дырэктара па эканоміцы і фінансах Юльяна ТУНЧЫК.

— За любым поспехам заўсёды стаяць людзі, іх жаданне і ўменне аддана працаваць, — перакананы **галоўны аграном ААТ «Агра-Кобрынскае» Іван ГУСАК.**

Сам Іван Іванавіч аддаў работе ў роднай гаспадарцы 31 год, з іх 27 гадоў займае адказную пасаду галоўнага агранома. «Мне пашанцавала тут працаваць!», — кажа ён.

— У апошнія гады сеем больш кукурузы, павялічылі пасевы рапсу, — распавядае галоўны аграном. — Ураджаі ў нас заўсёды добрыя. Летась, акрамя звычайных адрасоў адгрузкі нашай прадукцыі, паставілі таксама 60 тон рапсу на Мінскі маргарынавы завод.

— Нашы кірункі работы — у першую чаргу збожжавыя і рапс азімы, але ёсць і агародніна: 30 гектараў бульбы, капуста, морква, буракі сталовыя і цукровыя, — адзначае **дырэктар ААТ «Агра-Кобрынскае» Сяргей СЕЛІВЕСТРАЎ.** — Гароднінай забяспечваем найбліжэйшыя раёны: гандлёвую сетку, бальніцы, школы, дзіцячыя садкі. Гэта вялікая адказнасць, таму найважнейшай сваёй задачай лічым якасць.

Але галоўная культура на палях ААТ «Агра-Кобрынскае» — пшаніца. Невыпадкова гэтыя землі па старадаўняй традыцыі называюць пшанічнымі.

— Ад чаго залежыць ураджай? Ад зладжанасці работы калектыву, — разважае кіраўнік. — І, вядома, ад строгага захавання тэхналагічных працэсаў. У нас адна з найлепшых зямель у раёне. Бал раллі — 40. Але яшчэ мы дакладна па тэхналогіі ўносім мінеральныя, калійныя, азотныя і фосфарныя падкормкі, выкарыстоўваем сродкі засцярогі раслін, праводзім фунгіцыдныя апрацоўкі. На гэта выдаткоўваецца нямала сродкаў, але ж калі нічога не ўкласці, нічога і не атрымаеш.

УКЛАДАННІ СЯБЕ АПРАЎДВАЮЦЬ

Узяўшы за аснову гэты дэвіз, гаспадарка робіць стаўку на высокатэхналагічную, якасную сучасную тэхніку.

— Адзін з нашых апошніх набыткаў — CASE IH Magnum 340, шматфункцыянальны сельскагаспадарчы трактар і набор плугоў да яго, — кажа намеснік **дырэктара па эканоміцы і фінансах ААТ «Агра-Кобрынскае» Юльяна ТУНЧЫК.** — Трактар энерганасычаны, будзе выконваць усе энергазатратныя работы. Цяпер яго абкатваюць, учора наладжвалі плугі на полі. І гэта — зусім іншая апрацоўка зямлі! Пасля яго работы глеба на полі — як пух! Не так даўно, распавяла спецыяліст, гаспадарка набыла кормаўборачны комплекс бельгійскай вытворчасці. У выніку ўзрасла прадукцыйнасць працы: калі раней сіласную яму закладвалі за тыдзень, то цяпер на гэта дастаткова трох дзён.

— Сучасныя тэхналогіі мяняюць якасць кармоў для буйной рагатай жывёлы. Пры выкананні тэхналогій, калі адкрываеш сіласную траншэю, сілас пахне свежым хлебам, — усміхаецца Юльяна Васілеўна.

І гэта немалаважна, бо спецыялізацыя ААТ «Агра-Кобрынскае» — малако і мяса. Сёлета 80 % удояў з трох малочнатаварных фермаў рэалізоўвалася сортам «Экстра», астатнія 20 % — вышэйшым сортам.

— Надой малака на карову складае больш за 25 літраў. Гэта добры паказчык, — адзначае Сяргей Селівестраў.

— Гаспадарка забяспечвае сябе ўсім неабходным за кошт выручкі. Прыцягваем і крэдытныя сродкі, але ў нас не бывае пратэрміноўкі плацяжоў, — падкрэслівае намеснік дырэктара па эканоміцы і фінансах. — Своечасова выконваем дагаворныя абавязацельствы і, як вынік, маем добрыя адносіны з партнёрамі. У патрэбныя тэрміны закупляем і сродкі засцярогі раслін, і запчасткі — грошы немалыя, але ўкладанні сябе апраўдваюць. У поўным аб'ёме гаспадарка забяспечвае сябе кармамі на цэлы год, аж да новага ўраджаю. Ды яшчэ і прадаём лішкі. Перайшлі на ўласны размол збожжа. Летась у нас фуражнай пшаніцы не было, уся ішла трэцім класам — на муку вышэйшага гатунку. І кароўкі таксама елі пшаніцу трэцяга класа. Вядома, якасць кармоў непасрэдна ўплывае на якасць малака і мяса!

«ЗАЛАТЫ ФОНД»

Каму даверыць складаную, дарагую тэхніку? Зразумела, прафесіяналу, які мае вопыт работы і шануе машыны, адносіцца да іх беражліва. Яраслаў КОЦУР — высакакласны механізатар з вопытам работы больш за дзесяць гадоў. Менавіта ён падняўся ў кабіну новага, нядаўна набытага трактара Magnum 340. А высокатэхналагічны кормаўборачны комплекс гаспадарка даверыла Міхаілу Зайцу, таксама механізатару першага класа.

Асабліва важны чалавечы фактар падчас уборачнай — і збожжаўборкі, і корманарыхтоўкі: тут патрэбныя і вопыт, і талент, адзначае Сяргей Селівестраў. Таму высакакласныя прафесіяналы, здольныя працаваць у экіпажы камбайна падчас ворыва, жніва, уборкі кармоў, у любой гаспадарцы лічацца «залатым фондам». Работа на камбайне патрабуе пастаяннай увагі — трэба сачыць за рухавіком і навясным абсталяваннем, кантраляваць правільнасць зразання каласоў. Глядзець, каб за камбайнам не заставаліся нязжатыя палосы, — задача другога чалавека ў кабіне. На камбайнах працуюць па двое, экіпажамі, змяняючыся за рулём. Падчас уборачнай камбайнеры ў полі ад відна да відна, па 10–12 гадзін на суткі, а часам і больш. Таму важныя псіхалагічная сумяшчальнасць ды прафесіяналізм абодвух камбайнераў у экіпажы. Браты Ілья і Дзмітрый Карпіны прыйшлі працаваць у ААТ «Агра-Кобрынскае» па слядах бацькоў. Цяпер яны ў адным экіпажы збожжаўборачнага камбайна. У дзень адзін вопытны экіпаж можа ўбраць каля 20 гектараў поля. Калі на полі «палегліца», работа ідзе больш павольна, бо сцёблы трэба спачатку падняць. Дажджы першых тыдняў жніўня ўскладнілі ўборку, і збожжавыя прыходзіцца ўбіраць на самых малых хуткасцях, каб не страціць ніводнага зярнятка. Але камбайнеры ўпэўненыя: усе работы будуць завершаны ў тэрмін.

Галоўны аграном Іван ГУСАК.

Усяго ў гаспадарцы тры зернеўборачныя камбайны і, адпаведна, тры экіпажы. На 570 гектараў збожжавых гэтага дастаткова, кажа дырэктар: нагрузка на камбайны — па 190 га.

— Спраўляемся. Яшчэ і суседзям дапамагаем!

Дададзім, што гаспадарка лічыць неабходным укладваць не толькі ва ўраджай і якасць малака і мяса, але і ў сваіх супрацоўнікаў. У ААТ «Агра-Кобрынскае» адзін з самых высокіх у раёне ўзровень заработнай платы, таму ў гаспадарцы шмат моладзі.

Дзіяна РОНІНА.
Фота аўтара і Алены ДАЎЖАНОК.

УНП 200224881

Экіпажы камбайнаў. Злева направа ў першым радзе Станіслаў ГЕМБАЛЬ, Уладзімір НІКІЦЮК, у другім радзе Сяргей ЖОЛАХ, Ілья КАРПІН, Міхаіл ЗАЯЦ, Дзмітрый КАРПІН.

Механізатар Яраслаў КОЦУР.

МАЛОЧНЫЯ РЭКІ

ААТ «ГАРАДЗЕЦ-АГРА» — адзін з найбуйнейшых вытворцаў высакаякаснага малака

На ўрадлівай зямлі, дзе знаходзіцца аграгарадок Гарадзец, з пакалення ў пакаленне людзі займаліся сельскагаспадарчай працай. Сёння дойны статак у ААТ «Гарадзец-агра» — найбуйнейшы ў Кобрынскім раёне: больш за 3650 галоў. А ў цэлым на 12 фермах і комплексах змяшчаецца 11 662 галавы буйной рагатай жывёлы. Сёлета пагалоўе кароў (а разводзяць тут чорна-пярэстую і галшцінскую пароды) павялічылася на сто галоў. Выраслі і надоі, і якасць малака, і сярэдняя заработная плата ў гаспадарцы.

Старшы камбайнер Сяргей ТЫШЧУК.

Сваю цяперашнюю назву прадпрыемства атрымала ў 2003 годзе, а гісторыю вядзе з далёкага 1949-га. З 1982 года гаспадарка насіла імя «Калгас-камбінат імя Дзяржынскага». Цяпер землі ААТ «Гарадзец-агра» — без перабольшання палова Кобрынскага раёна, а каб аб'ехаць усе фермы і жывёлагадоўчыя комплексы, трэба праехаць 120 кіламетраў. ААТ «Гарадзец-агра» — гэта больш за 15 000 га сельгасугоддзяў і шэсць вытворчых участкаў. Размешчаныя на розных берагах Дняпра-Бугскага канала аб'екты звязваюць два паромы, якія ходзяць па раскладзе.

Сёння «Гарадзец-агра» — шматгаліновая сучасная гаспадарка па вытворчасці малака, мяса, сельскагаспадарчых культур. Гаспадарка з поспехам вырошчвае, збожжа, рапс, кукурузу, цукровыя буракі. Але асноўная спецыялізацыя — гэта мяса і малако.

Ветурач фермы «Кустовічы» Філіп ШУРХАЙ.

Фота Дзіяны РОНІНАЙ.

Дасягаецца якасць малака і мяса і за кошт таго, што кармы для жывёлы тут вырабляюць самастойна.

— Кармоў мы не закупляем, абыходзімся сваімі. Запас дазваляе забяспечыць жывёле разнастайны і паўнавартасны рацыён, — гаворыць **спецыяліст па ідэалагічнай рабоце ААТ «Гарадзец-агра» Наталля ПАКАЛЮК.** — Набываем толькі некаторыя мінеральныя дабаўкі і вітаміны для жывёлы. Але ніякія гарманальныя прэпараты не выкарыстоўваем.

РАБОТА — ТВОРЧАЯ

Паказчык паспяховасці гаспадаркі — не толькі вытворчыя дасягненні, але і дабрабыт людзей, якія працуюць у ёй; тое, ці хочуць людзі з навакольных населеных пунктаў уладкоўвацца сюды працаваць. І тут у ААТ «Гарадзец-агра» таксама

Жывёлавод па доглядзе цялят малочнага перыяду Святлана ГАЛЯК.

Трактарыст-машыніст Васіль БАНДАРУК.

— Ён добры псіхолаг, да кожнага ў калектыве знойдзе падыход, — тлумачыць Наталля Аляксандраўна і дадае, што кіраўнік робіць стаўку не толькі на тэхналагічнае абсталяванне, але і на прафесіяналізм, жаданне расці ў сваёй прафесіі і зацікаўленасць кожнага спецыяліста ў выніку працы.

— Таму ў нас у калектыве — толькі адказныя і працавітыя людзі, — кажа суразмоўніца. — Іншыя тут не затрымліваюцца.

Трактарыст-машыніст сельскагаспадарчага аддзялення № 6, перадавік вытворчасці Васіль БАНДАРУК прафесію абраў яшчэ ў сямнаццацігадовым узросце і застаецца ёй верны: роднаму прадпрыемству ён аддаў 40 гадоў жыцця. Пра работу кажа з любоўю:

— Гэта не завод, дзе стаў за станок і штампуеш адну дэталь. Гэта сельская гаспадарка. Творчая работа, якая патрабуе творчага падыходу. У нашай сферы заўсёды ўсё рознае, засумаваць не атрымаецца.

Жывёлавод па доглядзе цялят малочнага перыяду Святлана ГАЛЯК адвучылася ў Драгічыне на повара, але працаваць прыйшла ў паспяховую гаспадарку ААТ «Гарадзец-агра», працягнуўшы сямейную традыцыю — тут працуюць і яе бацькі. І не пашкадавала: добраўпарадкаваны пасёлак, стабільная зарплата і перспектывы росту. За дзесяць гадоў дзяўчына асвоіла тонкасці прафесіі, выйшла замуж. Маладой сям'і гаспадарка выдзеліла новы прасторны дом. Цяпер у яе падрастаюць дзеці, якія з часам могуць працягнуць працоўную дынастыю.

— Адзінае засмучэнне — прывязваешся да цялят, і калі яны падрастаюць, шкада аддаваць іх у дарослы статак, — расказвае Святлана.

У калектыве ААТ «Гарадзец-агра» больш мужчын, чым жанчын: догляд за буйнымі жывёламі — работа мужчынская, яна патрабуе і фізічнай сілы, і вытрымкі.

— Жанчыны ў асноўным даяркі, цялятніцы, загадчыцы фермаў, — пералічвае Наталля Аляксандраўна. — Работа жывёлавода, трактарыста, будаўніка, кіроўцы патрабуе мужчынскай рукі. Ёсць у гаспадарцы інжынерная служба, якая абслугоўвае і жывёлагадоўлю, і механізацыю.

Так што вяселлі ў аграгарадку гуляюць нярэдка, прычым часцяком па-старому — усёй вуліцай.

ААТ «Гарадзец-агра» і далей збіраецца павялічваць вытворчасць малака класа «Экстра» — гэта адзін з найбольш рэнтабельных напрамкаў работы гаспадаркі. Рост прыбытку дазволіць укараняць у вытворчасць сучасныя тэхналогіі, аблегчыць і мадэрнізаваць працу работнікаў і павысіць іх даход.

ПРАДУКТЫ ЗДАРОЎЯ

Малако ў Гарадцы выдатнае. Яго гаспадарка рэалізоўвае на перапрацоўчыя прадпрыемствы вышэйшым сортам і сортам «Экстра». Прычым на долю апошняга прыходзіцца больш за палову малочнай прадукцыі. Сёлета вытворчасць малака сорту «Экстра» вырасла, і гэта сапраўды значнае дасягненне.

— Каб называцца сортам «Экстра», малако павінна мець найлепшыя паказчыкі па колькасці саматычных клетак і мікраарганізмаў, — тлумачыць **галоўны заатэхнік Ірына ГАРБАЧОВА**. — Па гэтых паказчыках яно павінна быць чысцейшае больш чым у тры разы, чым малако першага сорту.

Такое малако, распавяла спецыяліст, — вынік зладжанай работы каманды прафесіяналаў: спецыялістаў па доглядзе за жывёламі, тэхнолагаў, адказных за кармы, ветэрынараў, даярак. Гэтым і вызначаецца значная розніца ў закупачных цэнах.

Са студзеня да чэрвеня на фермах «Гарадзец-агра» надаілі 9510 тон малака. Але не толькі малаком славіцца прадпрыемства. Тут вырошчваюць буйную рагатую жывёлу на мяса. Экалагічна чыстае мяса паступае на перапрацоўку на Брэсцкі мясакамбінат.

— Кажуць, што ўрач лечыць чалавека, а ветэрынар — чалавецтва, — распавядае аб сваёй прафесіі **малады ветурач фермы «Кустовічы» Філіп ШУРХАЙ.** Сапраўды, экалагічна чыстыя, натуральныя, здаровыя прадукты харчавання — краевугольны камень здароўя насельніцтва.

ўсё ў парадку: узровень заработнай платы ў гаспадарцы — адзін з самых высокіх сярод сельгаспрадпрыемстваў вобласці. Таму тут няма недахопу ні ў маладых, ні ў вопытных кадрах.

— Супрацоўнікаў у гаспадарцы больш за 400, — расказвае Наталля Аляксандраўна. — Многія пераязджаюць у аграгарадок з розных куткоў Беларусі. Шмат моладзі, таму на тэрыторыі цэлыя дзве школы і дзіцячыя садкі. І калі з іншых сельскіх населеных пунктаў моладзь з'язджае ў гарады, то сюды пасля вучобы — вяртаецца.

Тут з вялікай павагай кажуць пра кіраўніка гаспадаркі. **Дырэктар ААТ «Гарадзец-агра» Іван ЦЕЦЯРУК** узначальвае вялікую гаспадарку амаль 20 гадоў.

Жывёлаводы Наталля і Уладзімір АЛЯКСЕЕВЫ.

Дзіяна РОНІНА.
Фота Алены ДАЎЖАНОК.

УНП 200224866

СПРАВА ТЭХНІКІ

1 снежня ў ААТ «Батчы» пачне работу высокатэхналагічны жывёлагадоўчы комплекс

Тэхнік па племянной справе Ірына РУЦКАЯ.

Стабільна высокая якасць малака — адна з найважнейшых задач, якую ставіць перад сабой калектыў ААТ «Батчы». У гэтай другой па велічыні ў Кобрынскім раёне гаспадарцы вось ужо больш за паўгода практычна ўсё малако — дакладней, 99,7% — прадаюць гатункам «Экстра».

Дырэктар ААТ «Батчы» Сяргей ДЗЯНІСЕВІЧ.

Лічыцца, што колькасць і якасць малака залежаць ад трох «К» — каровы, кадры і кармы. У ААТ «Батчы» вядзецца работа па ўсіх гэтых напрамках: абнаўляецца дойны статак з мэтай зрабіць яго больш прадуктыўным (у цэлым пагалоўе буйной рагатай жывёлы на сённяшні дзень у гаспадарцы — 5300), пашыраецца кармавая база, вядзецца навучанне кадраў і ўкараняюцца сучасныя сельскагаспадарчыя тэхналогіі.

ры аперацыі. Напрыклад, апрацоўваць глебу, уносіць ўгнаенні і насенне. На нашым мехдвары — тры машыны нямецкай фірмы Fendt, кормаўборачны камбайн апошняга пакалення, новыя плугі і пасяўныя агрэгаты. Укладзеныя сродкі акупляюцца за два–тры сезоны, узрастае прадукцыйнасць працы ды якасць работ.

Акрамя таго, падкрэслівае спецыяліст, сучасныя тэхналогіі вымушаюць замест пяці–сямі спецыялістаў на тым ці іншым кірунку выкарыстоўваць працу толькі аднаго — але гэта павінен быць высакакласны прафесіянал, якому прапануюць, адпаведна, сапраўды высокую аплату. Але не варта баяцца, што ў сельскай гаспадарцы з часам стануць не патрэбныя чалавечыя рукі — на такой вытворчасці без людзей ніяк не абысціся, — кажа суразмоўнік.

Аграном-садавод Сяргей КРЫВАБЛОЦКІ.

Зернесушыльны комплекс.

Намеснік дырэктара Іван ХВІРЫСЮК.

ПРАЦАВАЦЬ ПА-НОВАМУ

— Наша канцэпцыя — сучасныя спосабы вядзення сельскай гаспадаркі, — адзначае **намеснік дырэктара ААТ «Батчы» Іван ХВІРЫСЮК.** — Калі раней тэхніка выконвала толькі адну аперацыю, то зараз нашы энерганасычаныя трактары здольныя выконваць адразу тры-чатыры аперацыі. Напрыклад, апрацоўваць глебу, уносіць ўгнаенні і насенне.

Паляводы Альбіна ДУДКО і Галіна ГАРДЗІЕЎСКАЯ.

З КАМП'ЮТАРАМ НА «ТЫ»

Ужо 1 снежня ў гаспадарцы з'явіцца жывёлагадоўчы комплекс еўрапейскага ўзроўню. Дадасца яшчэ тры тысячы галоў буйной рагатай жывёлы, з якіх 1200 галоў папоўняць дойны статак.

— Будзе ўсталяваная сучасная сістэма аўтаматычнай дойкі «Карусель» і іншае абсталяванне фірмы Westfalia, — адзначае намеснік дырэктара. — Каб працаваць на гэтым абсталяванні, неабходна тэхнічная адукацыя. Фірма Westfalia ўзяла на сябе абавязак навучыць нашых спецыялістаў. Навучанне праводзіцца ў Брэсце, завершыцца яно праходжаннем практыкі на аналагічным абсталяванні. І толькі потым супрацоўнікі змогуць прыступіць да працы.

Зрэшты, ужо сёння на ферме «Шыповічы», дзе ад кожнай каровы дояць 23–24 літры малака ў дзень, устаноўлена сучаснае абсталяванне. І загадчыкі ферм, і радавыя даяркі з камп'ютарам на «ты». У электронны каталог уносяцца нумар кожнай каровы, яе радавод і жыццёвая гісторыя, колькасць літраў малака і яго якасць. Механічна ажыццяўляецца і прамываннe вымені каровы, і сама дойка — персаналу застаецца толькі кіраваць працэсам. Да такіх умоў у гаспадарцы ўжо прывыклі. А новы комплекс, упэўненыя тут, павялічыць і без таго выдатныя надоі.

— Цяпер закупляем высокаўдойную жывёлу (нецялей і цёлак) у Пружанах, Астрамічах, іншых гаспадарках, — распавядае **галоўны заатэхнік Аліна САМАСЮК.** — З мэтай павышэння прадуктыўнасці вядзецца планамерная праца па абнаўленні статка. 33 галавы прыбудуць у дваццатых чыслах жніўня. Іх патэнцыял — 31–33 літры малака штодня.

Пры складанні меню для кароў (індывідуальнага для кожнай групы жывёл) тут таксама не абыходзяцца без навуковага падыходу.

— Сур'ёзна працуем з вітамінамі, макра- і мікраэлементамі, — падкрэслівае **дырэктар ААТ «Батчы» Сяргей ДЗЯНІСЕВІЧ.** — Плануем атрымаць па выніках года 8200 літраў малака з адной каровы. Рост чакаецца ў сувязі з абнаўленнем дойнага статка і пераглядам рацыёнаў.

З увядзеннем у эксплуатацыю новага жывёлагадоўчага комплексу пагалоўе буйной рагатай жывёлы ў ААТ «Батчы» складзе 9–10 тысяч жывёл. Для такога пагалоўя неабходна трывалая кармавая база, каб забяспечыць рост надояў і прывагі. І найважнейшая задача на бліжэйшую будучыню, якая стаіць цяпер перад аграрыямі ААТ «Батчы» — якраз сур'ёзна развіваць кармавую базу.

Галоўны заатэхнік Аліна САМАСЮК.

Даільная зала малочнатаварнай фермы «Шыповічы».

Фота Аляксандры АНЦЭЛЕВІЧ.

УРАДЖАЙНЫЯ ГЕКТАРЫ

— На сённяшні дзень у нас больш за сем тысяч гектараў зямлі, — адзначае Сяргей Дзянісевіч. — Гаспадарка па сваёй спецыялізацыі шматгранная. Асноўны кірунак нашай работы — жывёлагадоўля. Раней мы займаліся і агародніцтвам, і бульбаводствам, зараз пакінулі толькі цукровыя буракі і садоўніцтва — плошча нашага саду 164 гектары.

Пра сад хочацца расказаць асобна. Тут вырошчваюць яблыкі, алычу, слівы, грушы айчыннай і замежнай селекцыі. Садавіну з ААТ «Батчы» выкарыстоўваюць і Маларыцкі кансервава-агародніна-сушыльны камбінат (дзе вырабляюць вядомае дзіцячае харчаванне, а таму вельмі высокія патрабаванні да сыравіны), і Клецкі кансервавы завод, і Кіраўскі харчовы камбінат. У пашане і саджанцы пладовых дрэў з Батчы.

— Гаспадаркі Воранаўскага раёна Гродненшчыны практычна ўвесь свой сад пасадзілі нашымі саджанцамі, — кажа аграном-садавод Сяргей Крываблоцкі. — Растуць нашы дрэўцы і ў Магілёўскай вобласці.

Зразумела, вырошчвае гаспадарка і збожжавыя культуры. Жніво ўжо блізіцца да завяршэння.

— Уборачная ў нас сур'ёзная: толькі збожжавых трэба ўбраць 2400 га, — падкрэслівае дырэктар гаспадаркі. — Радуе ўраджайнасць: 42 ц/ га — плюс 10 цэнтнераў да ўзроўню мінулага года. Ужо ўбраныя і піваварны ячмень, і авёс. Дзяржзаказ выкананы цалкам, у тым ліку па рапсе, які быў пасеяны на 500 гектарах. У далейшым думаем актыўна займацца рапсам: гэта вельмі рэнтабельная культура. Сёлета ўраджайнасць рапсу — 32 ц / га. А структуру пасеваў збожжавых будзем пераглядаць у бок павелічэння кармавых культур.

Залог поспеху — не толькі сучаснае абсталяванне і дакладнае выкананне тэхналогій, гаворыць кіраўнік. Дасягаецца ён дзякуючы зладжанай працы калектыву.

— Мне не хацелася б адзначаць працу аднаго або двух чалавек: падзякі заслугоўвае практычна кожны. Проста хачу сказаць «дзякуй» усім, хто добрасумленна працуе ў ААТ «Батча». Нашы дасягненні — гэта наша агульная заслуга.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.
Фота Алены ДАЎЖАНОК.

УНП 200227666

Будаўніцтва, рамонт і ўтрыманне аўтамабільных дарог рэспубліканскага і мясцовага значэння калектыў філіяла КУП «Брэстаблдарбуд» ДРБУ № 201» горада Кобрын ажыццяўляе ўжо 55 гадоў.

Дарогі, што збліжаюць

Яны павінны быць якасныя і камфортныя

Фота Алены ДАЎКАНОК.

Сфера адказнасці Кобрынскага дарожнага рамонтна-будаўнічага ўпраўлення № 201 — больш за 540 кіламетраў аўтамабільных дарог, амаль 30 кіламетраў тратуараў і больш за 400 км сельскіх вуліц, 12 мастоў і нават дзве паромныя пераправы (у калектыве ДРБУ ёсць восем матросаў).

— Мы адказваем за амаль тысячу кіламетраў аўтамабільных дарог і вуліц Кобрынскага раёна, з іх 40 % — грунтавыя і гравійныя, — распавядае **дырэктар ДРБУ-201 Уладзімір КЛЫШКО.**

У напружаны вясна-летні перыяд у калектыве працуе больш за сто чалавек, зімой — 90-95 супрацоўнікаў.

Адна з найважнейшых задач, якая стаіць перад дарожнікамі Кобрынскага раёна, — пераход грунтавых і гравійных дарог у асфальтабетон, адзначае Уладзімір Клышко.

— Вясной, летам і восенню гравійкі адчуваюць сур'ёзныя нагрузкі. Напрыклад, цяпер, падчас уборачнай, па грунтавых і гравійных дарогах ідзе цяжкая сельскагаспадарчая тэхніка. Цвёрдыя дарожныя пакрыцці маюць вялікую апорную здольнасць, а тэхніка падымае менш пылу.

Сёлета ў асфальтабетон пераведзеныя дарога Н-874 Астромічы — Вялікія Прылукі — Закросніца, Н-857 Пяскі — Сухоўчыцы, Н-888 Батчы — Кляшчы.

— У раёне ўжо створана разгалінаваная сетка дарог, і новыя будаваць не так важна. Значна важней падтрымліваць якасць эксплуатацыі на ўжо існуючых, — адзначае суразмоўнік.

За сезон дарожнікі рэмантуюць 15–16 тысяч м² дарожнага пакрыцця. Таксама сёлета ДРБУ-201 выканала ямкавы рамонт на плошчы 12 тысяч квадратных метраў.

Самая вялікая праблема — неравышэнне міжрамонтных перыядаў, адзначае спецыяліст. Вельмі важна гэтага не дапускаць. Беларускі клімат для дарожнага пакрыцця можна назваць экстрэмальным, бо для аўтадарог значна больш небяспечныя адлігі ў зімовы перыяд, чым маразы, якія ўстанавіліся надоўга. У цэлым, асфальтабетоннае дарожнае пакрыццё патрабуе рамонту прыкладна раз на 20 гадоў, частата залежыць ад нагрузкі. Гэтым летам спецыялісты ДРБУ-201 адрамантавалі дарогі Кобрын — Магдалін, Пяскі — Патрыкі, Батчы — Кляшчы, Вялікія Лепясы — Лескава — Бяроза, Астромічы — Вялікія Прылукі — Закросніца.

Другарадных дарог не бывае — усе яны важныя для кагосьці. Бо гэта шляхі ад населенага пункта да населенага пункта, ад прадпрыемства да прадпрыемства ці арганізацыі, ад чалавека да чалавека. І гэтыя дарогі павінны быць якасныя і камфортныя.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

УНП 201006065

Государственное предприятие

«МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР ИНВЕСТИЦИЙ И ПРИВАТИЗАЦИИ»

30 августа 2021 г. **проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в Минском и Дзержинском районах**

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены). Предмет аукциона: право заключения договора аренды земельного участка.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462

		Лот 1	Лот 2	Лот 3	Лот 4	Лот 5
1	Адрес земельного участка	Минский район, Колодищанский с/с, аг. Колодищи	Минский район, Папернянский с/с, район аг. Вишневка	Минский район, г. Заславль, ул. Дехновка	Минский район, Крупицкий с/с, аг. Крупица	Дзержинский район, Добриневский с/с, п. Даниловичи
2	Кадастровый номер	623683403101007785	623685500001001049	623650100001004815	623683906601000639	622282002101000106
3	Площадь земельного участка, га	6,0098	1,7462	1,4160	0,0096	0,0891
4	Срок аренды (лет)	99	99	50	30	20
5	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания производственно-складского комплекса	Для строительства и обслуживания объекта придорожного сервиса	Для размещения объекта придорожного сервиса (кафе)	Для установки и обслуживания торгового павильона	Для строительства и обслуживания торгового павильона
6	Инженерная инфраструктура*	–	–	–	–	Электричество, газ
7	Условия, предусмотренные в решении местного органа власти об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона	–	–	–	–	–
8	Расходы по подготовке документации (руб.)	11 238,61	2 287,56	1 668,15	2 585,38	261,90
9	Начальная цена права заключения договора аренды (бел. руб.)	1 031 732,41	79 233,83	172 327,20	130,54	200,45
10	Задаток (бел. руб.)	206 346,00	15 846,00	34 465,00	26,00	40,00
11	Ограничения (обременения) прав на земельный участок	–	Зона санитарной охраны водного объекта, используемого для питьевого водоснабжения, контролируемая зона автомобильной дороги Р-58	Водоохранная зона Заславского водохранилища, контролируемая зона автомобильной дороги Р-28, охранная зона линий связи и радиофикации, охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000В	–	Водоохранная зона реки Жесть, контролируемая зона автомобильной дороги Н-8373

**В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, которые имеются в данном населенном пункте. Подключение к указанным коммуникациям возможно только в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.*

Аукцион состоится 30 августа 2021 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, по 24 августа 2021 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 17.00.

Контактный телефон + 375 (17) 516-80-64.

Задатки перечисляются не позднее 24 августа 2021 г. на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток (задатки) не позднее 24 августа 2021 г. в вышеуказанном (графа 10 таблицы) размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона);

представить в Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» – организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

- документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков), с отметкой банка;

- подписанное соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на внесение платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

- возместить соответствующему райисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся, заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор аренды земельного участка.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона райисполком предоставляет рассрочку внесения платы за предмет аукциона. Указанное заявление подается победителем аукциона в соответствующий райисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона (в предусмотренных законодательством случаях) в течение 6 месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта должен приступить к занятию земельного участка (начать строительство – осуществление строительно-монтажных работ в соответствии с утвержденной проектной документацией) в соответствии с целью и условиями его предоставления. В случае невыполнения данного требования право пользования (аренды) земельного участка прекращается в установленном порядке.

После истечения срока аренды земельного участка, предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен, в установленном порядке обращается в адрес соответствующего райисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной документацией по соответствующим земельным участкам. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Информация о проводимом аукционе опубликована на сайтах au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 14 сентября 2021 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже одним лотом объектов недвижимости – здания и помещения многофункциональных с составными частями и принадлежностями, передаточного устройства канализационная сеть, принадлежащих Открытому акционерному обществу «Гомельстекло» на праве собственности

Состав лота № 1:

здание многофункциональное, инв. № 350/С-81260. Местонахождение: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Островского, 101/1. **Назначение:** здание многофункциональное. Двухэтажное кирпичное строение, 1956 года постройки. Общая площадь 503,4 кв. м. Составные части и принадлежности: три кирпичные пристройки, терраса, навес.
Цікавая дэталь — у сярэдзіне XIX стагоддзя, нават нягледзячы на тое, што тут адбывалі пакаранне зняволеныя, турэмныя камеры не зачыняліся. Людзі маглі пакідаць іх і свабодна перасоўвацца па тэрыторыі турмы. Маляваць з натуры, як рабіў Орда, маліцца (тут была пабудавана каплічка), чытаць кнігу на лаўцы ва ўнутраным дворыку, проста шпацыраваць па брукаванцы і дыхаць свежым паветрам — вязням давяралі, бо многія з іх былі дваранамі, а значыць, дысцыплінаванымі людзьмі, якія не маглі здзейсніць учёкі.

Зайздросцілі Мядзёлцы

Калі да ўлады прыйшлі палякі, у Гродзенскай турме пачалі адбываць пакаранне не толькі крымінальныя злачынцы, а і палітычныя вязні. У прыватнасці, вядомы актывіст беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў Тамаш Грыб. Гэта быў вельмі радыкальны беларускі дзеяч, які ўдзельнічаў у многіх эпізодах расійскай рэвалюцыі 1917 года. Напрыклад, у знакамітым пасяджэнні Устаноўчага сходу Расіі, які разагналі бальшавікі. Тамаш Грыб выступаў не толькі супраць бальшавікоў, не мірыўся ён і з уладай палякаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Разам са сваімі аднадумцамі ён імкнуўся аднавіць незалежнасць Беларусі. Таму зразумела, што ворагам нумар адзін для іх была Польшча.

Разам з Грыбам у Гродзенскай турме сядзела і яго каханая, а потым жонка Паўліна Мядзёлка. Жанчына, якую любіў яшчэ і Купала, з'яўлялася старшынёй Грамады беларускай моладзі ў Горадні, арганізоўвала дзіцячыя прытулкі, беларускія школы. Яе арыштавалі разам з Тамашом Грыбам пасля таго, як у адным з нумароў газеты «Родны край», якую ён рэдагаваў, быў апублікаваны артыкул, дзе заклікалася змагацца з усім польскім. Ужо за такія радкі — «Гнёзды белага арла хутка будуць знішчаны» — можна было пазбавіцца волі. Так яно і атрымалася.

У сваіх успамінах Паўліна Мядзёлка прыгадвала, што ні адзін з яе гродзенскіх сяброў не адрэагаваў на просьбу перадаць у турму бялізну і адзенне. Хоць грэх было скардзіцца: за кратамі да жанчын адносіліся большменш паблажліва. Актрыса, напрыклад, часта шпацыравала па ўнутраным дворыку турмы, чытала газеты і кнігі, курыла цыгарэты, атрымлівала абеды з клуба — іншыя вязні маглі толькі зайздросціць Мядзёлцы, бо ў параўнанні з астатнімі турмамі ўмовы ўтрымання тут былі жорсткія. Затое заможныя зняволеныя мелі магчымасць зменшыць свой тэрмін пакарання: у Заходняй Беларусі працаваў суд, які дзякуючы добраму адвакату можна было выйграць.

Этнічны канфлікт

«За польскім часам», асабліва ў пачатку 1920-х гадоў, у Гродне быў вельмі моцны нацыянальны рух. Ішла сапраўдная барацьба за беларускую дзяржаўнасць. Многія зразумелі, што яны — беларусы, а таму маюць права жыць на сваёй зямлі, размаўляць на роднай мове. Аднак у палякаў былі іншыя мэты...

— Пасля падзелу Рэчы Паспалітай польскія ўлады доўгі час выношвалі ідэю аддзялення Польшчы ў межах 1772 года (а гэта і Беларусь, і Украіна, і Літва), — расказвае **дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Аляксандр ГОРНЫ.** — І калі пасля Першай сусветнай вайны гэтая ідэя стала магчымая, палякі стварылі незалежную дзяржаву, свой урад, армію. Яны пачалі праследаваць беларускіх актывістаў, зачыняць беларускія школы, якіх толькі за 1918—1919 гады на тэрыторыі Заходняй Беларусі было створана каля 300—400. Праследавалі праваслаўную царкву, масава адкрывалі касцёлы. Палякі праводзілі сапраўдны тэрор супраць беларускіх актывістаў, адбіралі ў сялян зямлю, якой у іх і так катастрафічна не хапала, каб перадаць яе польскім асаднікам. Усё гэта вылілася ў вельмі моцны этнічны канфлікт.

Трэба адзначыць, што Гродна быў другім цэнтрам нацыянальнага адраджэння пасля Вільні. Тут віравала сапраўднае беларускае жыццё. Невыпадкова ў 1919 годзе ў горад з Мінска пераехаў урад БНР. Адметны факт: некаторыя з тых, хто ў 1917 годзе далучыўся да нацыянальнага руху, нават не ведалі беларускай мовы. Прайшоў усяго год — і многія дзеячы не толькі размаўляюць, а і пішуць па-беларуску лісты, справаздачы, цікавяцца ўласнай гісторыяй.

— Палякі нават не разлічвалі на такі ўздым беларускага руху, — адзначае Аляксандр Горны. — Польскія ўлады глядзелі на беларусаў як на людзей другога сорту. Лічылі сваю культуру на парадак вышэйшай: мы, маўляў, яе вам нясём, вы яшчэ свой час стварылі беларусы. Грамадзянская вайна, рэвалюцыя — было шмат беспрытульных дзяцей. Калі да ўлады прыйшлі палякі, яны ніяк не дапамагалі ім. Захаваліся ўспаміны загадчыцы прытулку Станіславы Буйло (сястры знакамітай паэткі Канстанцыі Буйло), у якіх яна піша, што дзеці жывуць у настолькі жудасных умовах, што нават адзетыя ў мяхі з-пад бульбы, а пасля сну з-за холаду ў іх на тварах утвараецца раса. Жанчына звяртаецца да неабыякавых людзей, каб тыя дапамаглі дзецям.

Беларускі Гандзі і мары селяніна Сеўрука

Адбываў пакаранне ў Гродзенскай турме і знакаміты беларускі філолаг, аўтар першай «Беларускай граматыкі» Браніслаў Тарашкевіч. Менавіта тут ён перакладаў на нашу мову «Іліяду» Гамера, «Пана Тадэвуша» Міцкевіча. Тарашкевіча называлі беларускім Гандзі, бо ён быў сімвалам барацьбы нашых папярэднікаў за свае правы, лідарам 100-тысячнай Беларускай сялянска-работніцкай грамады — арганізацыі, якая раздаржнення Польшчы ў межах 1772 года (а гэта і Беларусь, і Украіна, і Літва), — расказвае **дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Аляксандр ГОРНЫ.** — І калі пасля Першай сусветнай вайны гэтая ідэя стала магчымая, палякі стварылі незалежную дзяржаву, свой урад, армію. Яны пачалі праследаваць беларускіх актывістаў, зачыняць беларускія школы, якіх толькі за 1918—1919 гады на тэрыторыі Заходняй Беларусі было створана каля 300—400. Праследавалі праваслаўную царкву, масава адкрывалі касцёлы. Палякі праводзілі сапраўдны тэрор супраць беларускіх актывістаў, адбіралі ў сялян зямлю, якой у іх і так катастрафічна не хапала, каб перадаць яе польскім асаднікам. Усё гэта вылілася ў вельмі моцны этнічны канфлікт.

Трэба адзначыць, што Гродна быў другім цэнтрам нацыянальнага адраджэння пасля Вільні. Тут віравала сапраўднае беларускае жыццё. Невыпадкова ў 1919 годзе ў горад з Мінска пераехаў урад БНР. Адметны факт: некаторыя з тых, хто ў 1917 годзе далучыўся да нацыянальнага руху, нават не ведалі беларускай мовы. Прайшоў усяго год — і многія дзеячы не толькі размаўляюць, а і пішуць па-беларуску лісты, справаздачы, цікавяцца ўласнай гісторыяй.

— Палякі нават не разлічвалі на такі ўздым беларускага руху, — адзначае Аляксандр Горны. — Польскія ўлады глядзелі на беларусаў як на людзей другога сорту. Лічылі сваю культуру на парадак вышэйшай: мы, маўляў, яе вам нясём, вы яшчэ свой час стварылі беларусы. Грамадзянская вайна, рэвалюцыя — было шмат беспрытульных дзяцей. Калі да ўлады прыйшлі палякі, яны ніяк не дапамагалі ім. Захаваліся ўспаміны загадчыцы прытулку Станіславы Буйло (сястры знакамітай паэткі Канстанцыі Буйло), у якіх яна піша, што дзеці жывуць у настолькі жудасных умовах, што нават адзетыя ў мяхі з-пад бульбы, а пасля сну з-за холаду ў іх на тварах утвараецца раса. Жанчына звяртаецца да неабыякавых людзей, каб тыя дапамаглі дзецям.

Удзельнікі акруговага з'езду Таварыства беларускай школы ў Гродне, 1927 год. (Пётр Сяўрук — *у другім радзе чацвёрты злева*).

Беларускі Гандзі і мары селяніна Сеўрука

Адбываў пакаранне ў Гродзенскай турме і знакаміты беларускі філолаг, аўтар першай «Беларускай граматыкі» Браніслаў Тарашкевіч. Менавіта тут ён перакладаў на нашу мову «Іліяду» Гамера, «Пана Тадэвуша» Міцкевіча. Тарашкевіча называлі беларускім Гандзі, бо ён быў сімвалам барацьбы нашых папярэднікаў за свае правы, лідарам 100-тысячнай Беларускай сялянска-работніцкай грамады — арганізацыі, якая

«дзякуй» павінны сказаць. Калі, сустракаючыся з Пілсудскім, беларускія дзеячы пачалі прасіць, каб Польшча прызнала незалежнасць Беларусі, ён ім адказаў: «Незалежнасць Беларусі — гэта блеф. Нават не думайце пра гэта». Праўда, прапанаваў дапамагчы беларусам стварыць «беларускі П'емонт» (своеасаблівы нацыянальны тэрытарыяльны цэнтр), на аснове якога калі-небудзь узнікне Беларусь. Вядома, гэта была гульня.

Увогуле, многае, што абяцалі палякі, не спраўдзілася. Варта хоць бы згадаць такі эпізод. У Гродне існаваў дзіцячы прытулак, які ў сваёй масавасцю напалохала палякаў.

Сядзелі за гэтымі кратамі і актывісты яшчэ адной шматлікай нацыянальна-вызваленчай арганізацыі — Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Сярод асуджаных быў і актывіст Таварыства беларускай школы Пётр Сяўрук. Малады хлопец са Скідзеля, які нарадзіўся перад Першай сусветнай вайной, жыў у бежанстве ў Ліпецку. Вяртаецца на радзіму, а тут — галеча. Быў час, калі яму даводзілася хадзіць у дзіравых ботах, перакручаных дротам. Пётр пачынае аднаўляць гаспадарку. У хлопца неверагодная праца да ведаў, ён марыць аб нацыянальным самавызначэнні беларусаў. На жаль, да гэтага шчаслівага дня Пётр не дажыў: у 1929 годзе ён памёр ад сухотаў. Хваробу займеў у турмах, праз якія прайшоў.

Захаваліся ўспаміны Пятра Сеўрука аб часе, калі ён знаходзіўся за кратамі Гродзенскай турмы: «Змешчаны я быў у камеры адзін і пры гэтым было адабрана ўсё, што было ў мяне. Ні алоўка, ні паперы не было, толькі накрэсленыя алоўкам ці цвіком надпісы або лозунгі сведчылі аб тым, што ў камеры калісьці былі заключаны іншыя такія ж, як я. Я адчую нейкую блізкасць да гэтых сваіх папярэднікаў і выказаў гэтае пачуццё напісаннем на сцяне наступнай фразы (па-беларуску): «Я адзін, але я адчуваю прысутнасць кожнага, хто тут быў, бо я злучаны з імі адной доляй».

Турэмнае паўстанне

Чалавекам, што пакінуў такі надпіс на турэмным засценку, мог бы быць і вядомы заходнебеларускі пісьменнік Валянцін Таўлай. Паэт сам пасля расказваў, што падчас прагулак па тэрыторыі турмы ён незаўважна падымаў каменьчыкі, якімі на падлозе ў камеры пісаў вершы. Магчыма, пісаў і на сценах. Дарэчы, зняволеныя, якія пасля заканчэння тэрміну выходзілі на свабоду, ведалі гэтыя вершы на памяць, а таму расказвалі сваім знаёмым — Таўлай выйшаў на волю ўжо вядомым паэтам. У Гродзенскай турме ён сядзеў двойчы: першы раз быў арыштаваны за падпольную дзейнасць у 1929 годзе, другі — за спробу перайсці савецка-польскую граніцу ў 1934-м. Апошні раз быў асуджаны на восем гадоў, але дзякуючы вызваленчаму паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь быў вызвалены раней.

Калі зняволеныя даведаліся, што савецкія войскі перайшлі польскую граніцу, у турме пачалося паўстанне, арганізатарам якога быў яшчэ адзін паэт — Піліп Пястрак, дзеяч Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. Вязні некалькі дзён утрымлівалі турму пад сваім кантролем, пакуль Гродна не занялі чырвонаармейцы. Некаторым удалося збегчы, а паколькі польскія ўлады, у тым ліку паліцыя, былі яшчэ ў горадзе, пачалося ўзброенае супраціўленне. Вязні турмы абараняліся ў Свята-Пакроўскім саборы ў Гродне, які дагэтуль захаваўся.

Вераніка КАНЮТА.
г. Гродна.

ЧАРАДЗЕЙНАЕ ПЯРО І ПРЫВІД КЛАСІКА

Блізіцца 65-гадовы юбілей літаратурнага музея Якуба Коласа

Адразу некалькі важных «коласавых» дат прыпадае на жнівень. Па-першае, дзень смерці Якуба Коласа: паэт сышоў з жыцця 65 гадоў таму, 13 жніўня 1956 года. Па-другое, 65-гадовы юбілей дома-музея пісьменніка, які адбудзецца 16 жніўня.
Аб нашым класіку сказана, здаецца, усё: літаратуразнаўцы аналізуюць творы, настаўнікі распавядаюць біяграфію, а прыхільнікі творчасці ў чарговы раз перачытваюць «Новую зямлю». Але візуалізаваць жыццёвы шлях пісьменніка дапамагаюць менавіта музеі. Напярэдадні юбілею музея «Звязда» сустрэлася з Марыяй КАЗАКЕВІЧ — загадчыцай навукова-асветніцкага аддзела літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

Дом пісьменніка, нягледзячы на тое, што ён знаходзіцца ў самым цэнтры Мінска, удала «схаваўся» ад гарадскога шуму і мітусні. Здаецца, што гэты кавалачак зямлі нібы ўзялі з беларускай глыбінкі і казачным чынам перанеслі ў сталіцу. Стварэнню гэтай ілюзіі дапамагаюць старыя дубы, якія растуць у садзе. Пісьменнік пераехаў сюды ў 1944 годзе і пражыў тут да самай смерці.

Праз тры дні пасля смерці паэта, 16 жніўня 1956-га, была прынята пастанова «Аб увекавечанні памяці народнага паэта Якуба Коласа», адным з пунктаў якой было: стварыць у Мінску літаратурны музей Якуба Коласа Акадэміі навук БССР і філіял гэтага музея ў сяле Мікалаеўшчына.

— Для першых наведвальнікаў музей адчыніў свае дзверы 4 снежня 1959 года, — распавядае Марыя Казакевіч. — Штогод 13 жніўня, у дзень смерці Якуба Коласа, члены сям'і паэта, літаратары, грамадскія дзеячы, мастакі, навукоўцы, супрацоўнікі музеяў горада Мінска, а таксама ўсе неабыякавыя збіраюцца разам, каб ушанаваць памяць славутага пісьменніка.

Першым дырэктарам музея, а таксама захавальнікам і збіральнікам фонду стаў старэйшы сын паэта Данііл Канстанцінавіч Міцкевіч. Ён займаў гэтую пасаду дваццаць гадоў і за згаданы час правёў вялікую пошукавую работу. Першы паверх дома прысвечаны літаратурна-дакументальнай экспазіцыі. Там прадстаўлены фотаздымкі з сямейнага архіва, лісты Якуба Коласа, а таксама некаторыя экзэмпляры рэдкіх выданняў. Другі паверх мемарыяльны: падняўшыся па лесвіцы, вы зможаце ўбачыць пакоі, у якіх жылі сыны паэта, гасцёўню з вялікім раялем і, вядома ж, рабочы кабінет самога Якуба Коласа. Дарэчы, менавіта за тым сталом, падчас напісання ліста да сябра, у трынаццаць гадзін дваццаць хвілін, паэт памёр.

Сёння музей ладзіць шмат мерапрыемстваў. Як адзначае Марыя Казакевіч, многія актыўнасці накіраваны на моладзь: «Мы імкнёмся да таго, каб музей стаў своеасаблівай культурнай пляцоўкай для правядзення вольнага часу, а не пыльным архівам, як цяпер мяркуе моладзь».

«Крочым у школу разам з Коласам»: праект, адрасаваны дзеткам, якія вучацца ў пачатковай школе. Прэзентацыі, квэст-гульні, віктарыны, майстар-класы, тэматычныя заняткі, экскурсіі, а таксама разнастайныя віды творчай дзейнасці дапамагаюць раскрыць здольнасці, закладзеныя ў кожным дзіцяці з нараджэння, пазнаёміць з беларускай мовай, літаратурай і культурай.

«Кватэрнік у дзядзькі Якуба» — гэта сустрэчы з музыкантамі. На вечарыны запрашаюцца маладзёжныя музычныя гурты, літаратары-пачаткоўцы, акцёры, і кожны ахвотны можа завітаць у музей і далучыцца да сучаснай беларускай культуры.

«Мясцінамі Коласа ў Мінску» — пешаходная экскурсія па мясцінах, звязаных з паэтам. Можна наведаць дворык Акадэміі навук, на карысць якой Якуб Колас працаваў больш за трыццаць гадоў, прагуляцца да плошчы Якуба Коласа і ўбачыць помнік паэту і героям яго твораў работы Заіра Азгура.

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ І СОВЕТА МІНІСТРАЎ БССР

Аб увекавечанні памяці народнага паэта БССР Якуба Коласа (Міцкевіча Канстанціна Міхайлавіча)

З мэтай увекавечання памяці народнага паэта БССР Якуба Коласа (Міцкевіча Канстанціна Міхайлавіча) ЦК КП Беларусі і Совет Міністраў БССР **пастанаўляюць:**

1. Перайменаваць Лагойскі тракт горада Мінска ў вуліцу імя Якуба Коласа.
2. Перайменаваць Камароўскую плошчу ў Мінску ў плошчу імя Якуба Коласа.
3. Прысвоіць імя Якуба Коласа Мінскаму паліграфічнаму камбінату, сярэдняй беларускай школе № 44 горада Мінска, Дому творчасці пісьменнікаў у Каралішчавічах Мінскага раёна, фундаментальнай бібліятэцы Акадэміі навук БССР.
4. Прысвоіць Інстытуту мовы Акадэміі навук БССР імя Якуба Коласа.
5. Прысвоіць імя Якуба Коласа школе-інтэрнату ў горадзе Нясвіжы.
6. Устанавіць помнік Якубу Коласу на плошчы яго імя ў горадзе Мінску.
7. Устанавіць бюст Якуба Коласа на яго радзіме ў сяле Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці.
8. Устанавіць мемарыяльныя дошкі на будынку Пінкавіцкай сярэдняй школы Мінскага раёна Брэсцкай вобласці, дзе настаўнічаў паэт, на Доме творчасці пісьменнікаў у Каралішчавічах Мінскага раёна, дзе жыў і працаваў паэт.
9. Стварыць у горадзе Мінску літаратурны музей Якуба Коласа Акадэміі навук БССР і філіял гэтага музея ў сяле Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці—на радзіме паэта.
10. Устанавіць стыпендыі імя Якуба Коласа для студэнтаў— адну ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя Леніна і адну ў Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага.
11. Даручыць прэзідыуму Акадэміі навук БССР і праўленню Саюза пісьменнікаў БССР на працягу 1957—62 гг. выдаць поўны збор твораў Якуба Коласа.

ЦК КП БЕЛАРУСІ. СОВЕТ МІНІСТРАЎ БССР.

Затым у парку імя Максіма Горкага даведацца месцазнаходжанне даваеннага дома сям'і Міцкевічаў, пра дом Коласа на Старажоўцы, што сям'я паэта арандавала пэўны час у заможнага гаспадара Вільгельма Русецкага. Праз Свіслач ляжаў шлях да дома Янкі Купалы, з якім Колас звязвалі гады шчырага сяброўства. Далей прайсці да Мінскага астрога, дзе паэт правёў тры гады ў зняволенні, даведацца пра Коласа-педагога каля Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Выпускныя і вяселлі ў доме Якуба Коласа. Пры папярэднім заказе ў музеі можна адзначыць важную дату. Раней вялікай папулярнасцю карысталася святкаванне вяселля ў доме пісьменніка. Калі малодшы сын Якуба Коласа Міхась Канстанцінавіч быў жывы, ён даваў маладым бласлаўленне на шчаслівае жыццё. Таксама маладыя падпісвалі пяром і чарнілами Коласа пагадненне на шлюб. Тыя паперы захоўваюцца ў музеі да гэтага дня.

Зразумела, што свае сляды Якуб Колас пакінуў не толькі ў Мінску. Нарадзіўся паэт у вёсцы Акінчыцы, сучасная тэрыторыя Стаўбцоўскага раёна. А вось раней гэтыя землі належалі самім Радзівілам, у той час бацька пісьменніка працаваў лесніком у іх уладаннях.

Сёння тыя хаты, у якіх жыла сям'я Міцкевічаў, таксама ператвораныя ў музеі. Іх асноўнай мэтай з'яўляецца адлюстраванне дзяцінства пісьменніка. Акрамя таго, філіялы знаёмяць з бытам беларускіх сялян.

Атрымліваецца, што элементы спадчыны паэта захаваліся ў розных месцах: і ў Стоўбцах, і ў мінскім доме, і ў самой сям'і Якуба Коласа. Каб азнаёміцца з усім гэтым, трэба будзе выдаткаваць не адзін дзень. Але вынік варты намаганняў. Хоць бы дзеля таго, каб у сваёй свядомасці зламаць школьны стэрэатып пра тое, што Якуб Колас — гэта толькі аўтар «Новай зямлі». Вам адкрыецца шмат цікавых фактаў пра яго і як пра рознабаковага творцу, і як пра чалавека. Ці ведалі вы, напрыклад, што Колас быў адным з першых уладальнікаў тэлевізара ў Беларусі? Або што ў яго было шэсць машын, кожная з якіх адпавядала рознаму перыяду ў жыцці (дарэчы, сам Колас падзяляў жыццё на кругі). У доме-музеі вам распавядуць

❍ Цікавыя факты

• У доме-музеі жыве прывід. Супрацоўнікі музея мяркуюць, што гэта дух самога пісьменніка. Ужо не адзін раз розныя людзі чулі тагасветныя гукі: нібы па лесвіцы падымаецца пажылы чалавек. Супрацоўнікі прызнаюцца, што ў такія моманты ім робіцца крыху жудасна.

• У дуб, які некалі пасадзіў сам Якуб Колас, трапіла маланка. На жаль, дрэва знаходзіцца ў аварыйным стане і ў хуткім часе яго прыйдзецца ссячы, бо інакш яно можа зваліцца на дом.

• На тэрыторыі музея жыве вавёрачка Ядвіся. Калі вам пашанцуе сустрэць звярка, яго можна пачаставаць арэхамі.

• Пяро, якім пісаў Колас, здзяйсняе жаданні. У гэтым прызнаюцца як самі наведвальнікі, так і супрацоўнікі музея. Трэба проста напісаць ім запаветную мару і набрацца цярпення. Такую магчымасць дом-музей дае раз на год: падчас «Ночы музеяў» ці ў Дзень усіх закаханых.

• Калі пачалася вайна, Колас вырашыў з'ехаць з Мінска. Ён схаваў свае рукапісы і асабістыя рэчы ў сейфе, які закапаў на тэрыторыі парка Горкага. Ужо пасля вайны той сейф выкапалі і адчынілі. На жаль, рукапісы не захаваліся, але засталіся срэбныя чаркі. Цяпер гэтая скрыня стаіць у кабінеце пісьменніка. Як кажуць супрацоўнікі музея, падняць яе вельмі складана.

Няхай юбілей музея не пройдзе незаўважаны.

Арына КАРПОВІЧ .
Здымкі з фонду музея.

КАБУЛ ПАД ПРЫЦЭЛАМ

Што адбываецца ў Афганістане?

Днямі ў Кабуле прайшла цырымонія, якая сімвалізуе завяршэнне 20-гадовай вайсковай прысутнасці ЗША ў Афганістане. Камандуючы амерыканскім кантынгентам у гэтай краіне генерал Осцін Мілер афіцыйна пакінуў сваю пасаду. Мірныя перагаворы аб сітуацыі ў Афганістане поспеху не прыносяць. Пакуль амерыканскія ваенныя ўдарныя тэмпамі пакідаюць краіну, рух «Талібан» захоплівае ўсё новыя гарады, паступова сціскаючы кола вакол Кабула. Суседнія дзяржавы чакаюць новую хвалю бежанцаў. Што адбываецца ў Афганістане, чаго чакаць надалей?

Крывавае лета

Падзеі развіваюцца імкліва і зусім не на карысць афганскіх уладаў. Увечары ў аўторак баевікі «Талібана» заявілі, што ўзялі пад кантроль горад Фарах, цэнтр аднайменнай правінцыі, а таксама Пулі-Хумры — цэнтр паўночнай правінцыі Баглан. Раніцай у сераду яны паведамілі аб захопе горада Файзабад, цэнтра правінцыі Бадахшан. Такім чынам, пад кантролем баевікоў знаходзяцца ўжо дзевяць з 34 адміністрацыйных цэнтраў Афганістана. Паводле дадзенай напярэдадні ацэнкі Еўрасаюза, талібы кантралююць 65 працэнтаў тэрыторыі краіны, пад пагрозай нападу яшчэ больш за дзесяць гарадоў, паведаміла Бі-бі-сі. Як заўважыў прадстаўнік ЕС, задачу супрацьстаяць талібам выконваюць афганскія сілы спецыяльнага прызначэння колькасцю каля 75 тысяч чалавек. Па ацэнцы эксперта, гэта найбольш баяздольныя часткі, на падрыхтоўцы якіх інструктары НАТА рабілі ўпор. Колькасць усёй афганскай арміі перавышае 180 тыс. чалавек.

«Талібан» актывізаваў наступленне пасля таго, як Афганістан пачалі пакідаць амерыканскія войскі. Па словах экспертаў, гэта амаль паралізавала дзейнасць ваенна-паветраных сіл краіны — да 80 працэнтаў іх персаналу, уключаючы тэхнічны, складалі замежныя вайскоўцы. Вывад сіл ЗША і НАТА значна падарваў маральны дух Афганскіх нацыянальных сіл абароны і бяспекі (АНСАБ) і сістэму іх забеспячэння, інфармаваў прадстаўнік. Паводле яго слоў, ВПС краіны нярэдка не падтрымліваюць аперацыі спецназа з-за лагістычных праблем. Талібы сталі часцей атакаваць ваенныя часткі і кантрольна-прапускныя пункты, перастаўшы апасацца кааліцыйных сіл Захаду. Байцам АНСАБ часяком не хапае падрыхтоўкі і баявога вопыту для эфектыўнага супрацьстаяння нападам.

Пулі-Хумры, які «Талібан» напярэдадні назваў адной са сваіх мэт, здаўся пасля доўгіх баёў. «Днём талібы прарваліся скрозь лінію фронту ў некалькіх кірунках. Пасля цяжкіх баёў чыноўнікі і сілы бяспекі адступілі з будынка ўрада, офіса спецслужбаў і галоўнага паліцэйскага ўчастка. Баі працягваюцца. Мы вырашаем, куды адступіць», — так адзін з гарадскіх чыноўнікаў апісаў раніцай у сераду сітуацыю журналісту газеты Guardian.

У Бадахшане армія таксама адступіла пасля баёў, сказаў у гутарцы з агенцтвам Reuters прадстаўнік урада правінцыі Джавад Муджадыдзі. З падзеннем яе сталіцы, Файзабада, талібы «атрымалі кантроль над усім паўночным усходам», дадаў ён. Варта заўважыць, што правінцыя Бадахшан мяжуе з Таджыкістанам, Пакістанам і Кітаем.

Пасля з'явілася інфармацыя аб тым, што сотні супрацоўнікаў сіл бяспекі Афганістана з усім сваім рыштункам здаліся талібам у аэрапорце правінцыі Кундуз. Пра гэта паведаміла агенцтва AFP са спасылкай на мясцовага чыноўніка. У сераду міністр фінансаў Афганістана Халід Паенда падаў у адстаўку і пакінуў краіну, перадала агенцтва Bloomberg. Прычынай адстаўкі ў міністэрстве назвалі захоп «Талібанам» важных мытных пунктаў на граніцах краіны і страты бюджэту. У гэты ж дзень прэзідэнт краіны Ашраф Гані вылецеў у Мазары-Шарыф, які экстрэмісты называлі адной са сваіх наступных мэт. Ён сустрэўся з былымі палявымі камандзірамі — лідарам таджыкскай дыяспары Ато Мухамадзі Нурам і Абдулам-Рашыдам Дустумам.

«Я лічу, што адна з прычын таго, чаму «Талібан» прасоўваецца ў Афганістане, не сустракаючы супраціўлення, — тое, што людзі, і асабліва старэйшае пакаленне ў аддаленых вёсках, страцілі рэшткі даверу да цэнтральнага ўрада, ведаюць, што амерыканцы сыходзяць, і лічаць, што без іх дапамогі ўлады ў Кабуле ўсё роўна доўга не пратрымаюцца», — распавёў ТАСС афганскі журналіст і палітолаг Абдул Валі Сідзікі. Бяздзейнасць цэнтральнага ўрада, паводле яго слоў, толькі падмацоўвае гэтае ўражанне: «У сталіцы чакалі значна больш спакойнага лета, якое можна было б, напрыклад, правесці за мірнымі перагаворамі, але нічога з таго не выйшла. Затое выявілася іншае: улады не ў стане аказаць падтрымку ўласным салдатам. Постсавецкія краіны цяпер на адлегласці стрэлу ад талібаў, і з гэтай пары можна чакаць росту экстрэмісцкай актыўнасці яшчэ і ў іх».

Смяротная фаза

Былы кіраўнік аб'яднанага камандавання брытанскіх узброеных сіл генерал Рычард Бэранс раскрытыкаваў рашэнне вывесці з Афганістана групоўку заходніх войскаў, назваўшы яго стратэгічнай памылкай. У эфіры Бі-бі-сі ён дапусціў тры сцэнарыі развіцця канфлікту. «Я думаю, што варыянтаў развіцця можа быць тры, хоць, вядома, ніякіх сцэнарыяў ніхто не піша. Першы — Афганістан распадаецца. Ён ператвараецца ў іншыя краіны. Другі — жудасная грамадзянская вайна, вечная патавая сітуацыя, у якой ніводны з бакоў не можа перамагчы і не жадае спыняць барацьбу. Гэта дзесяцігоддзі смерці. Трэці варыянт — той, за які мы павінны змагацца ўсім светам. Пасля кульмінацыі баявых дзеянняў, гэта значыць калі «Талібан» зразумее, што гвалтам больш нічога не даб'ецца, а ўрад — што не верне сабе страчанае сілай, павінен пачацца чарговы раўнд палітычных перагавораў», — заўважыў Бэранс.

У гэтых перагаворах будуць актыўна ўдзельнічаць іншыя бакі — ЗША, Еўропа, Пакістан, Расія і Іран. Ніводнай з гэтых краін не патрэбныя суседнія дзяржавы, якія раздзіраюцца вайной. Новае слова ў перагаворах можа сказаць Кітай, які быў цалкам іншай краінай дваццаць гадоў таму, калі заходнія войскі прыйшлі ў Афганістан. «Мы сутыкнёмся з небяспекай вяртання ў Афганістан тэрарыстычных арганізацый, якія будуць шкодзіць Еўропе і іншым краінам. Думаю, гэта вельмі дрэнны вынік са стратэгічнага пункту гледжання», — лічыць Рычард Бэранс.

Па словах спецпасланніка ААН па Афганістане Дэборы Лаенс, вайна ўступіла ў «больш смяротную і больш разбуральную фазу», у выніку чаго толькі за апошні месяц у ходзе наступлення талібаў было забіта звыш тысячы мірных жыхароў, прычым амаль палова забітых і параненых — жанчыны і дзеці. Пастаянны прадстаўнік Афганістана пры ААН Гулам Ісакзай абвінаваціў талібаў у выкарыстанні больш за 10 тыс. замежных баевікоў з 20 груповак, у тым ліку «Аль-Каіды». Паводле яго даных, з сярэдзіны красавіка талібы арганізавалі звыш 5,5 тысячы нападаў у 31 з 34 правінцый Афганістана. Пры гэтым яны працягваюць карыстацца падтрымкай Пакістана.

«Афганістан так і застаўся краінай, якая больш за ўсё пакутуе ад тэрарызму. У 2019 годзе ў краіне ад рук тэрарыстаў загінулі 5725 чалавек (41 % ад усіх загінулых у свеце), прычым талібы ўзялі на сябе адказнасць за 87 % гэтых смерцяў. У 2020 годзе сітуацыя не змянілася: у Афганістане было зафіксавана звыш 25 тысяч актаў гвалту — на 10 % больш, чым у 2019-м, — заўважыў у сваім артыкуле для «Жэньмінь жыбаа» доктар палітычных навук, ганаровы прафесар Інстытута Тайхэ, калішні генеральны сакратар ШАС Рашыд Алімаў. — Беспрэцэдэнтны гвалт перайшоў і на 2021 год: сёлета ў першым квартале ў Афганістане, па ацэнцы ААН, было зарэгістравана 7177 інцыдэнтаў у галіне бяспекі, што на 61 % больш, чым за той жа перыяд 2020 года. З пачатку лета з-за ваеннай актыўнасці талібаў становішча пагоршылася яшчэ больш.

Акрамя таго, за два дзесяцігоддзі знаходжання амерыканскіх ваенных і сіл НАТА на афганскай зямлі, Афганістан ператварыўся ў аднаго з галоўных вытворцаў і пастаўшчыкоў наркотыкаў: на долю Афганістана ў апошнія пяць гадоў прыходзілася каля 84 % сусветнай вытворчасці опіуму, тады як да пачатку ваеннай аперацыі — усяго 5 %. Галоўнае — заходняй кааліцыі не ўдалося ачысціць афганскую зямлю ад атрутных каранёў міжнародных тэрарыстычных арганізацый. Наадварот, радыкальны рух «Талібан» за гэтыя гады замацаваў свае пазіцыі ў Афганістане. «Сышлі ў цень», але не з тэрыторыі краіны, ячэйкі «Аль-Каіды». Усё большую актыўнасць на афганскай зямлі праяўляе тэрарыстычная арганізацыя «Ісламская дзяржава». У цэлым, рэзка павялічваецца прысутнасць у Афганістане розных тэрарыстычных, экстрэмісцкіх і сепаратысцкіх груповак.

Такім чынам, шматпланавая ваенна-палітычная і гуманітарная аперацыі ЗША і іх саюзнікаў па НАТА ў Афганістане, нягледзячы на каласальныя выдаткі — па некаторых ацэнках, да 1 трыльёна долараў, — не прынеслі мір, бяспеку і стабільнасць у краіну. Не адбылося галоўнага — палітыка-дыпламатычнага ўрэгулявання ўнутрыафганскага канфлікту і фарміравання на шырокай аснове ўлады, якая мела б масавую падтрымку сярод афганскага насельніцтва. На вачах сусветнай супольнасці Афганістан ізноў ператвараецца ў выбухованебяспечны ачаг напружанасці для ўсяго Еўразійскага рэгіёна».

Гарады рыхтуюцца да аблогі

Дамоўленасці з «Талібанам» аб вывадзе войскаў ЗША дасягнулі яшчэ пры адміністрацыі Трампа, аднак у аўторак вечарам прэзідэнт Джо Байдэн заявіў, што не шкадуе аб вывадзе войскаў. «Мы выдаткавалі больш за трыльён долараў за 20 гадоў, мы трэніравалі і забяспечылі сучасным абсталяваннем 300 тысяч супрацоўнікаў афганскіх сіл бяспекі. Мы страцілі тысячы чалавек, — сказаў Джо Байдэн. — Яны павінны змагацца. Іх больш, чым талібаў».

Тым часам стала вядома, што ЗША накіравалі ў Афганістан бамбардзіроўшчыкі B-52 Stratofortress для барацьбы з талібамі. Іх колькасць не паведамлялася, самалёты наносілі ўдары па пунктах у правінцыях Кандагар, Герат, Лашкаргах і Гільменд. Прадстаўнік Мінабароны Афганістана Фавад Аман заявіў, што група талібаў стала мэтай B-52 у горадзе Шыберган правінцыі Джаўзджан. Паведамляецца, што талібы панеслі цяжкія страты ў выніку авіяўдараў ВПС ЗША.

У сваю чаргу, баевікі перасцераглі ЗША ад умяшальніцтва ў тое, што адбываецца ў Афганістане. Пра гэта заявіў прадстаўнік палітычнага офіса «Талібана» ў эфіры тэлеканала Al Jazeera, паведаміла PIA «Навіны». Талібы заявілі, што яны адказваюць на дзеянні ўрада Ісламскай рэспублікі, які «распачаў вайну ў шэрагу правінцый». Прадстаўнікі руху таксама нагадалі, што пагаднення аб спыненні агню ў краіне не існуе, а дзеянні «Талібана» з'яўляюцца толькі «рэакцыяй на напады» з боку ваенных афіцыйнага Кабула.

«Ключавая задача для талібаў — узяць у аблогу асноўныя магістралі і парты, такім чынам утрымліваць у кольцы цэнтры правінцый, аказваць палітычны, ваенны і эканамічны ціск на Кабул, — распавёў ТАСС заснавальнік і кіраўнік кабульскага Інстытута праблем міру і вайны, палітолаг Энаят Наджафізада. — Недастатковая кампетэнтнасць ваеннага кіраўніцтва і нізкая якасць кіравання на мясцовым узроўні — важная прычына хуткіх поспехаў талібаў». Іх наступленне непрымальнае для ўсіх, заўважыў эксперт. Калі яно адбудзецца, «то радыкальныя ісламісты падыміуць галаву на вялікай прасторы ад Пакістана да краін Цэнтральнай Азіі. Ваенная перамога талібаў, калі раптам яна здарыцца, ні ў якім разе не прынясе стабільнасці. Зусім наадварот, яна выльецца ў крывапралітную грамадзянскую вайну, і тая выйдзе за межы Афганістана, далучыць суседнія краіны, прынёсшы ім зацяжную нестабільнасць і хаос», — папярэдзіў Энаят Наджафізада.

Палажэнне абвастрае сітуацыя з бежанцамі. Напрыклад, з захопленага талібамі ў канцы мінулага тыдня Кундуза збеглі тысячы чалавек, яны распавядаюць пра трупы на вуліцах горада. Тым не менш, жыццё тут працягваецца. «Людзі адкрываюць крамы, але ў іх вачах заўважны страх», — заўважыў яшчэ адзін уцякач. «Талібан» адкрыта заяўляе, што яго мэта — узяць пад кантроль эканоміку Афганістана і гандаль нафтай і газам.

Ваенныя эксперты папярэджваюць, што ў выпадку паражэння ўрадавых сіл Афганістан можа стаць новай базай міжнароднага тэрарызму, якая будзе выкарыстоўвацца для нанясення ўдараў у тым ліку і па Еўропе. Асабліва гэта верагодна, калі краіна распадзецца на часткі ў выніку канфлікту.

Вялікія гарады Афганістана рыхтуюцца да аблогі — за іх сценамі сабраліся тысячы бежанцаў. Замежныя пасольствы запасаюцца ежай і вадой, мноства дыпламатаў пакідае гарады. Між тым, па ацэнцы амерыканскіх ваенных крыніц, якія цытуе Washington Post, Кабул пры цяперашнім развіцці падзей можа быць захоплены ў тэрмін ад 30 да 90 дзён.

Захар БУРАК.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Магчыма, лёс будзе выпрабоўваць вас на трываласць, аднак вы пераадолееце перашкоды, калі будзеце верыць у сябе і не станеце звяртаць увагі на плёткі і чуткі. Не варта баяцца перамен, паспрабуйце адмовіцца ад коснасці старых уяўленняў. У канцы тыдня, апынуўшыся перад адказным выбарам, праявіце стрыманасць і карэктнасць.

ЦЯЛЕЦ. Добры час для завяршэння важных спраў і аналізу сітуацыі. Будзьце ўпэўненыя ў сваіх сілах і магчымасцях. Імправізуйце, не дзейнічайце па шаблоне. Лепш пайсці на кампраміс у спрэчных момантах, чым страціць давер і дружбу. На рабоце пазбягайце няёмкіх сітуацый і праявіце вытрымку.

БЛІЗНЯТЫ. Ваш графік работы аптымізуюць менавіта так, як вам хацелася. Цяпер наогул час ажыццяўлення вашых жаданняў. Удачу абяцаюць прынесці новыя ідэі і кантакты. У асабістым жыцці зоркі абяцаюць сур'ёзныя перамены. І зноў жа якраз тыя, якія вы даўно чакалі.

РАК. На гэтым тыдні не засмучайцеся з-за дробязяў: аптымізм дазволіць змяняць сітуацыю ў патрэбным для вас кірунку. Не трэба забываць, што самы просты варыянт — не заўсёды самы лепшы. У канцы тыдня вы паспяхова здасце любы экзамен і атрымаеце выгадную прапанову па рабоце.

ЛЕЎ. Асноўны час паглыне работа. Важна паставіць перад сабой выразную мэту і прытрымлівацца яе, а не распыляцца па дробязях. У канцы тыдня варта арганізаваць сустрэчу сяброў і забыцца на праблемы і справы. У выхадныя добра было б пазбавіцца ад чагосьці старога і непатрэбнага — нехай гэта будуць рэчы або адносіны.

ДЗЕВА. Аптымізм дапаможа вам перажыць складаны пачатак тыдня. Ад начальства лепш трымацца далей, бо яму не заўсёды падабаецца ваша ініцыятыўнасць. Часам варта прадэманстраваць руплівасць. Сітуацыя ў канцы тыдня будзе падштурхоўваць да самастойнай дзейнасці або да пошуку новай работы.

ШАЛІ. Работа не запатрабуе ад вас залішняга напружання, з'явіцца магчымасць часцей бываць дома. На гэтым тыдні зможаце пераканацца ў адданасці тых, каго вы любіце. У сераду планы могуць змяніцца пад уплывам знешніх абставін. У выхадныя ад вашага настрою будзе залежаць настрой навакольных. Паспрабуйце змякчыць канфлікт, не давайце яму разрасціся.

СКАРПІЁН. Вашы справы пойдуць значна больш паспяхова, калі для рэалізацыі сваіх планаў заручыцеся падтрымкай каханага чалавека. У сярэдзіне тыдня вас чакаюць удалае вырашэнне складаных пытанняў, прыбытак і выгадныя прапановы. З уласцівай вам упартасцю і працавітасцю зможаце дасягнуць вялікіх вяршынь.

СТРАЛЕЦ. Паспрабуйце не адкладваць важныя справы, за вас іх ніхто не скончыць. З калегамі праяўляйце дыпламатычнасць і ў той жа час паслядоўнасць, адстойваючы свае погляды. Не адмаўляйцеся ад камандзіровак і падарожжаў. Праверце надзейнасць новых партнёраў, перш чым пачынаць сумесную дзейнасць.

КАЗЯРОГ. Не бойцеся змарнаваць час. Паездкі, сустрэчы, новыя ўражанні — гэта лепш, чым аднастайнасць і нуда. На рабоце паспрабуйце быць больш стрыманыя, не варта даваць нагоду для плётак. Падарожжа, якое пачнецца ў пятніцу, можа апынуцца на рэдкасць удалым. Так што адпраўляйцеся ў адпачынак, калі вы там яшчэ не былі.

ВАДАЛІЙ. Асцерагайцеся занадта прывабных прапаноў і лісьівых прамоў — вы рызыкуеце стаць ахвярай падману і маніпуляцый. Не ўзвальвайце на сябе празмерны груз клопатаў і спраў. Варта звяртаць увагу на дробязі. Інтуіцыя — цяпер добры дарадца. У выхадныя не сядзіце дома.

РЫБЫ. На гэтым тыдні вы атрымаеце шанц яскрава праявіць свае здольнасці, паказаўшы сябе з лепшага боку. Але не забывайце адзначаць і поспехі іншых. Хваліць трэба не толькі сябе. На рабоце важнае ўменне працаваць у камандзе. У выхадныя адпачніце, забудзьцеся пра свае праблемы і сумныя думкі.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.46	20.41	14.55
Віцебск —	5.32	20.35	15.03
Магілёў —	5.36	20.31	14.55
Гомель —	5.38	20.23	14.45
Гродна —	6.02	21.56	14.54
Брэст —	6.07	21.51	14.44

Месяц

Маладзік 8 жніўня.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Гурыя, Дзмітрыя.*
К. *Максіміляна, Яўсея.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Варта ведаць

Зменены тарыфы на чыгуначныя перавозкі пасажыраў

Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве антымонапольнага развіцця і гандлю.

Рашэнне аб пераглядзе тарыфаў прынята ў рамках запланаванага павышэння рэгуляваных цэн і тарыфаў у 2021 годзе («Тарыфны сшытак») у мэтах падтрымання ўзроўню акупнасці перавозак пасажыраў чыгуначным транспартам.

Так, напрыклад, кошт праезду пасажыраў цягнікамі рэгіянальных ліній эканомкласа па напрамку Мінск-Пасажырскі — Беларусь павялічыцца на 6 капеек, Мінск-Пасажырскі — Маладзечна — на 17 капеек.

А вось кошт рэгіянальных ліній бізнес-класа па кірунку Мінск-Пасажырскі — Орша павялічыцца на 43 капейкі, Мінск-Пасажырскі — Баброўск — на 35 капеек.

Тарыфы на праезд пасажыраў на цягніках гарадскіх ліній у межах аднаго тарыфнага пояса павялічаны на 15 капеек і ў межах двух тарыфных паясоў — на 30 капеек.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Даты. Падзеі. Людзі

14 ЖНІЎНЯ

У краіне

1916 год — нарадзіўся Фёдар Іванавіч Лісовіч, адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Пінскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У партызанах з ліпеня 1941-га: радавы, камісар атрада, у маі—ліпені 1944-га — камандзір партызанскай брыгады імя С. М. Кірава, адначасова з канца 1942-га да ліпеня 1944-га сакратар Лунінецкага падпольнага райкама КП(б)Б.

1931 год — нарадзіўся Пётр Рыгоравіч Рыцік, беларускі вучоны ў галіне эпідэміялогіі і вірусалогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па пытаннях дыягностыкі, лячэння і прафілактыкі дыфтэрыі, рэцыдыўных формаў сыпнога тыфу, асаблівасцям небяспечных вірусных гемарагічных ліхаманак, ВІЧ-інфекцыі.

1936 год — нарадзіўся Іван Сцяпанавіч Шпакоўскі, беларускі літаратуразнаўца, крытык, даследчык праблем тэорыі літаратуры, шляхоў развіцця беларускай, рускай і ўкраінскай паэзіі.

1941 год — нарадзіўся Леанід Мікалаевіч Давыдзенка, беларускі вучоны ў галіне эканамічнай тэорыі, педагог, аўтар падручнікаў для ВНУ па асновах эканамічнай тэорыі, мікра- і макраэканомікі.

2001 год — герб і сцяг г. Хойнікі і Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці ўнесены ў Гербавы матрыкул Рэспублікі Беларусь.

У свеце

1921 год — нарадзіўся Джорджа Стрэлер, італьянскі тэатральны рэжысёр і акцёр, тэатральны дзеяч, заснавальнік і кіраўнік міланскага «Пікалатэатра».

1941 год — на борце англійскага лінкора «Прынц Валійскі» прэзідэнт ЗША Франклін Дэлана Рузвельт і прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Уінстан Чэрчыль падпісалі «Атлантычную хартыю» аб агульных мэтах вайны супраць фашысцкай Германіі і аб пасляваенным уладкаванні свету. 24 верасня 1941-га на Лонданскай міжсаюзнай канферэнцыі СССР абвясціў аб далучэнні да асноўных палажэнняў хартыі, што стварыла перадумовы для ўтварэння антыгітлераўскай кааліцыі.

У гэты ж дзень нарадзіўся Дэвід Ван Кортленд Кросбі, амерыканскі гітарыст, спявак і аўтар песень, акцёр. Акрамя сольнай кар'еры вядомы як удзельнік і сузаснавальнік трох гуртоў. Кросбі быў уведзены ў Залу славы рок-н-рола двойчы: за работу ў The Byrds, а таксама па выніках супрацоўніцтва з Crosby, Stills & Nash.

Так гаварыў...

ПЕЙН:

«Армія прынцыпаў праўвецца там, дзе не пройдзе армія салдат».

УСМІХНЕМСЯ

Наўрад ці ёсць больш легендарная бітва, чым сутычка ў паліклініцы «Я запісаны па часе» *vs* «Тут жывая чарга!»

Для сур'ёзных адносін шукаю дзяўчыну, для якой будучыня сям'я, дзеці і муж маюць значэнне большае, чым змесціва яе смартфона...

Не бывае бескарысных рэчаў, бывае маленькі балкон.

Жанчына падчас чысткі зубоў паспявае вымыць ракавіну, мыльніцу, працерці кран. А мужчына... Мужчына думае, што яны не пэцкаюцца.

Трэба пачаць класціся спаць учора, а не сёння...

— Нам патрэбныя твае навыкі забойцы. Вось грошы, цэль хітрая і небяспечная.

— Забяры свае 10 рублёў, я не буду выганяць асу з пакоя!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2173.

Нумар падпісаны ў 19.30

13 жніўня 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12